ЦАНА НУМАРУ—5 КАП.

УМОВЫ ПАДПІСКІ (з дармовым дадаткам „Прафрук")

На 1 мес.	— 90 к.
„ 3 мес.	2 р. 60 к.
„ 6 мес.	5 р. —
„ 12 мес.	9 р. 75 к.

ПЛАТА ЗА АБВЕСТКІ

За радок нонп. пасьля тэксту—50 к., іншагародніе абвесткі—1 р. за радок. Пасярод тэксту—у два разы даражэй. Пры шматразовым друкаваньні—скідка. Звыш тарыфу, згодна пастановы СНК ад 10-IX—24 г. бярэцца 10 проц. -вдагку.

Падпіска і абвесткі прымаюцца ў гал. канторы газ. „ЗЬВЯЗДА" Менск, Савецкая, 63, 3-ці паверх, тэл. 7-81.

ЗЬВЯЗДА

ПРАЛЕТАРЫ УСІХ КРАЁЎ, ЗЛУЧАЙЦЕСЯ!

Орган Цэнтральнага Камітэту Камуністычнае партыі (бальшавікоў) Беларусі і Менскага АК КП(б)Б

ТЭЛЕФОНЫ:

Рэдактар	10-74
Сакратар	6-19
Партсэктар	13-80
Сэктар інфармацыі	13-80
Начны рэдактар	6-42
Галоўная кантора	7-81
Аддзел падпіскі	7-81
» абвестак	7-81

СУБОТА 14 чэрвеня 1930 г.

№ 137 (3735)

Год выданьня—XIV.

РЭДАКЦЫЯ І ГАЛОЎНАЯ КАНТОРА МЕНСК, Савецкая, 63.

Да вынікаў работ XIII зьезду КП(б)Б

...рактэрнай рысай нашай партыі, ...рый, якая рабіла яе заўсёды згуртаванам і кіруючым авангардам рабочае клясы—гэта яе выключная прынцыповасць у пытаньнях барацьбы за лінію і жорсткая крытыка ўсіх ухаў ад гэтай лініі, усіх памылак і прымірэнчых адносін да іх. У адносінах да недахопаў і промаў партыя заўсёды ўжывала разгорнутую бальшавіцкую самакрытыку, якасноўны мэтад мабілізацыі шырокіх мас пралетарыяту для хуткага выпраўленьня гэтых недахопаў.

...зьезд КП(б)Б і асабліва абгаварэньне справаздачы ЦК КП(б)Б паказалі, што КП(б)Б у падыходзе да ацэнкі прадзенага этапу і вырашэньня тых вялікіх і гістарычных задач, якія стаяць перад партыяй, падыходзіла іменна та па-бальшавіцку ставячы пытаньні барацьбы за чыстату генэральнай лініі. ...інулы пэрыяд ад 12-га да 13-га зьезду КП(б)Б быў пэрыядам разгорнутага наступленьня на капіталістычныя элементы па ўсім фронце, быў пэрыядам вялізарных посьпехаў у справе будаўніцтва сацыялізму ПА ЎСЁЙ ЛІНІІ. Гэты пэрыяд быў пачаткам выкананьня пяцігадовага пляну, які пераўтварае Беларусь з краіны гаспадарчага галаў у краіну са шпарка разгортваючымся прамысловым будаўніцтвам. Гэты быў пэрыяд, калі, дзякуючы правільнай палітыцы нашай партыі, мы і ў СССР змаглі забясьпечыць КАРЭННЫ ПАВАРОТ АСНОЎНЫХ СЯЛЯНСКІХ МАС ДА САЦЫЯЛІЗМУ. Гэты пэрыяд пачынаўся рашучым пераломам у справе разгортваньня калектывізацыі, асноўнага шляху для сацыялістычнай перабудовы сельскай гаспадаркі, скасаваньня вытворчых форм змычкі пролетарыяту з сялянствам і пасьпяховага вырашэньня збожжавай праблемы. Гэты пэрыяд, калі ўся наша партыя тым ліку і КП(б)Б, зрабіла суровую гістарычнай важнасьці паварот ...ітыкі выцісьненьня і абмежаваньня шчадка па палітыцы ліквідацыі яго, ...ы, на аснове суцэльнай калектывізацыі.

...сё наша сацыялістычнае будаўніцтва праходзіла у абставінах абвостранай класавай барацьбы. Толькі права-апартуністычныя ідэолёгі маглі лічыць, што будаўніцтва сацыялізму, якое разгорнулася пры нашым узмоцненым наступленьні на капіталістычныя элементы, гораду і вёскі, магло адбывацца без шалёнага супраціўленьня гэтых элементаў, без абвастрэньня клясавай барацьбы.

Абвостраная клясавая барацьба, нажск кулацтва, націск дробна-буржуазных стыхіі на пасасовныя зьвены партыі выклікалі ўнутры партыі умацненьне хістаньняў сярод пасасобных элементаў яе, парадзілі ўхілы ад правільнай лініі партыі і, перш за ўсё на даным этапе—ухілы права-апартуністычнага характару. Пройдзены ад 12 зьезду КП(б)Б пэрыяд быў пэрыядам умоцненай барацьбы нашай арганізацыі супроць правага апартунізму, як поўнай небясьпекі, супроць «левых», супроць сярэдняцкіх перагібаў, супроць рэвізыўных трацкісцкіх настрояў. Гэты пэрыяд быў пэрыядам, калі наша партыя, ажыцьцяўляючы Ленінскую нацыянальную палітыку, актыўна і пасьпяхова змагалася супроць нацыяналізму іх полерау і супроць нацыянал-апартуністычнага ўхілу ўнутры радоў КП(б)Б.

Гэты багаты, па сваім гістарычным месьцы пэрыяд, меў і мае для нашай КП(б) яшчэ і тое вялікае значэньне, што і гэты час наша партыя, пад кіраўніцтвам ЦК, ліквідавала рад значных правых ухілаў на паасобных вучастках сацыялістычнага будаўніцтва.

Партыя за гэты час правяла сур'ёзнае змаганьне з прышчэпаўшчынай, якая была і зьяўлялася найбольш яркім выяўленьнем правага ўхілу і якаяягнула нашу партыю на шлях капіталістычнага разьвіцьця сельскае гаспадаркі БССР і такім чынам—на шлях умацаваньня капіталістычных элементаў нашага краю. Партыя ўдарыла з сёй сілай па права-апартуністычным кіраўніцтве Наркамсьветы, Сампрамгаапэрацыі і г. д.

Абмеркаваньне справаздачы ЦК КП(б)Б і абмеркаваньне ўсіх іншых пытаньняў, што стаялі ў парадку дня зьезду, ахапілі сабою ўвесь гэты загацейшы і важнейшы з пункту погляду разьвіцьця і росту нашай партыі, з пункту погляду ...сяго сацыялістычнага будаўніцтва БССР, пэрыяд. Дэлегаты зьезду з вялікай актыўнасьцю падпарадкавалі крытычнаму аналізу праробленую работу і, на падставе гэтага аналізу, вырашалі задачы будучага. Палітычная актыўнасьць зьезду, разгорнутая бальшавіцкая самакрытыка, пад знакам якое праходзілі спрэчкі, зьяўляецца лепшым адказам на абвінавачаньні апартуністых усіх масьцей, якія яны кідаюць па адрасе партыі аб «казарменным рэжыме ў партыі», аб «перараджэньні партыі» і г. д., і г. д.

ПАРТЫЯ РАСЬЦЕ, НАША КП(б)Б БАЛЬШАВІЗУЕЦЦА і гэта знайшло сваё яркае адлюстраваньне ў работах усяго зьезду.

Усе дэлегаты, выступаўшыя па дакладу ЦК, і зьезд у цэлым, ва ухваленай ім разалюцыі па справаздачы ЦК, адзначылі ПРАВІЛЬНАСЬЦЬ ПАЛІТЫЧНАЙ ЛІНІІ ЦК. Гэты факт зьяўляецца фактам выключнага палітычнага значэньня. Цяпер, калі на нашу партыю, яе лінію, мы маем узмоцненыя атакі з боку апартуністычных і нацыянал-апартуністычных элементаў, уся КП(б)Б у абліччы свайго зьезду цьвёрда, ясна і рашуча заявіла, што палітычная лінія, якую ажыцьцяўляў і ажыцьцяўляе ЦК КП(б)Б, зыходзіла з генэральнай лініі ЦК УсеКП(б) і была цалкам правільнай.

ЦК КП(б)Б за мінулы пэрыяд былі дапушчаны памылкі ў галіне калектывізацыі. Але палітычная лінія ЦК КП(б)Б у пытаньнях калектывізацыі была правільнай і гэта з выключнай аднадушнасьцю адзначыў зьезд. Дапушчаныя памылкі былі своечасова выпрулены Цэнтральным Камітэтам і па-бальшавіцку ім прызнаны. ЦК КП(б)Б, пасьля вядомых артыкулаў т. Сталіна, актыўна і рашуча павёў змаганьне за ліквідацыю тых перагібаў, якія меліся ў радзе мясцовых партыйных арганізацый у пытаньнях калектывізацыі.

Як вядома, на паасобных партканфэрэнцыях былі спробы атакаваць усю лінію ЦК КП(б)Б па пытаньнях калектывізацыі і выявіць яе, як лінію няправільную. Былі спробы, па існасьці сваёй апартуністычныя, узваліць на ЦК КП(б)Б усю віну за меўшыя месца перагібы і памылкі. Гэтыя спробы працягваюцца ў выглядзе паасобных вылазак права-апартуністычных элементаў на ячэйках нашай партыі пры абмеркаваньні тэзісаў палітбюро УсеКП(б) да XVI зьезду УсеКП(б). На зьезьдзе такія спробы не знайшлі простага і яўнага адлюстраваньня. Зьезд аднадушна і акрэсьлена даў адпор усякім спробам, меўшым месца ў нашай арганізацыі, паставіць пад сумненьне пытаньне аб правільнасьці лініі Цэнтральнага Камітэту. Зьезд не замазваў памылак Цэнтральнага Камітэту, наадварот, зьезд раскрытыкаваў гэтыя памылкі і далучыўся цалкам да вядомай рэзалюцыі Бюро ЦК КП(б)Б у гэтым пытаньні ад 17 красавіка г. г. Але зусім ясна, што АСНОЎНЫ ВЫНІК абгаварэньняў важнейшага пытаньня, пытаньня аб кіраўніцтве, з боку Цэнтральнага Камітэту справай калектывізацыі, выражаецца ў прызнаньні ПРАВІЛЬНАСЬЦІ палітычнай лініі ЦК.

Зьезд і разгорнутыя спрэчкі прызналі правільным тое актыўнае змаганьне, якое вяла і вядзе партыя пад кіраўніцтва ЦК на два фронты, за лінію партыі. Зьезд з усёй рэзкасьцю падкрэсьліў, што задача ўзмацненьня змаганьня супроць ухілаў ад лініі партыі і, перш за ўсё, супроць правай небясьпекі, як галоўнай, застаецца асноўнай і важнейшай задачай партыі, выкананьне якое забясьпечыць правільнае кіраўніцтва ўсім сацыялістычным будаўніцтвам.

Усе факты апошніх дзён, якія гавораць аб тым, што права-апартуністычныя элементы прабуюць зноў ажывіць сваю дзейнасьць—пацьвярджаюць неабходнасьць усямернага завастрэньня змаганьня з правым апартунізмам і «лемымі» загібамі, якія ўзмацняюць пазыцыі правага апартунізму.

Спэкулюючы на часовых труднасьцях нашага будаўніцтва, правыя элементы зноў выцягваюць зараз з арсэналу свайго антыпартыйнага змаганьня ўсю сыстэму сваіх поглядаў, якія цягнуць нашу партыю назад, якія цягнуць да рэстаўрацыі капіталізму ў нашым краі. Правыя атакуюць лінію партыі на ўзмоцненыя тэмпы індустрыялізацыі, правыя рэвізуюць партыйную лінію на калектывізацыю, правыя робяць нашу лінію прычынай меўшых месца перагібаў, правыя дыскрэдытуюць партыйнае кіраўніцтва. Панікёрскімі крыкамі аб размычцы з серадняком гэтыя кулацкія агенты ў радох нашай партыі імкнуцца сьпіхнуць партыю на шлях уступак кулацтву і атакаваць нашу палітыку на ліквідацыю кулацтва, як клясы, у раёнах суцэльнай калектывізацыі.

Асноўная дырэктыва зьезду—УЗМАЦНЕНЬНЕ ЗМАГАНЬНЯ З ПРАВАЙ НЕБЯСЬПЕКАЙ, ЯК ГАЛОЎНАЙ НА ДАНЫМ ЭТАПЕ, І «ЛЕВЫМ» АПАРТУНІЗМАМ—павінна быць асноўнай кіруючай дырэктывай ва ўсёй рабоце нашай партыі. Наша партыя давала і будзе даваць бязьлітасны адпор усякім спробам ці справа, ці «зьлева» атакаваць партыйную лінію. Наша партыя, у абліччы свайго зьезду, патрабавала ад былых лідэраў правай апазыцыі ня толькі адмаўленьня ад сваіх капітулянцкіх поглядаў, але і актыўнай барацьбы з ухіламі ад генэральнай лініі партыі і ў першую чаргу—супроць правага ўхілу.

Наперакор апартуністым правага і «левага» толку, наша партыя з усёй бальшавіцкай цьвёрдасьцю і пасьлядоўнасьцю будзе і далей трымаць курс на павышаныя тэмпы індустрыялізацыі, ажыцьцяўленьне лёзунгу—ВЫКАНАНЬНЯ ПЯЦІГОДКІ ЗА ЧАТЫРЫ ГАДЫ. Для ажыцьцяўленьня гэтай асноўнай задачы партыя будзе і далей з пасьпехам мабілізаваць вакол сябе шырокія масы рабочае клясы. Партыя будзе і далей ажыцьцяўляць лінію на суцэльную калектывізацыю сельскай гаспадаркі, бяднацка-сярэдняцкіх мас сялянства і на яе аснове ліквідацыю кулацтва, як клясы. Для партыі зусім ясна, што шлях для зьнішчэньня труднасьцяй, у прыватнасьці труднасьцяй харчовага забясьпячэньня, асабліва па лініі мяса і тлушчаў, ляжыць не ў адступленьні ад нашай лініі, якое прапануюць правыя апартуністы, а ў рашучым ажыцьцяўленьні курсу на індустрыялізацыю і калектывізацыю краю.

Вырашэньне збожжавай праблемы, якая яшчэ два гады таму назад стаяла, як надзвычай вострая праблема, ішло іменна па шляху калектывізацыі сельскай гаспаркі і стварэньня буйных збожжавых саўгасаў, г. ё. па тым шляху, супроць якога актыўна змагаліся правыя апартуністы. Так і зараз, вырашэньне другой важнейшай праблемы, праблемы жывёлагадоўлі можа ісьці і пойдзе толькі па шляху далейшага ажыцьцяўленьня калектывізацыі сельскае гаспадаркі і стварэньня буйных жывёлагадоўчых саўгасаў. Партыя наша не замазвае тых труднасьцяй, якія стаяць на шляху сацыялістычнага будаўніцтва. Але калі правыя апартуністы імкнуцца сваёй пазыцыяй УВЕКАВЕЧЫЦЬ ГЭТЫЯ ТРУДНАСЬЦІ, то наша партыя змагалася і будзе змагацца з посьпехам за хутчэйшае зжыцьцё гэтых труднасьцяй. І вакол змаганьня за ажыцьцяўленьне пяцігодкі ў чатыры гады, за калектывізацыю сельскае гаспадаркі, за разгорнутае наступленьне на рэшткі капіталізму, партыя, наперакор капітулянству, ганебнаму панікёрству, у змаганьні з хістаньнямі і ўхіламі ад лініі партыі, мабілізавала і будзе мабілізаваць шырокія масы працоўных.

Толькі змагаючыся з прышчэпаўшчынай і яе хутарскай палітыкай, змагаючыся з права-апартуністычнай агентурай кулацтва ўнутры партыі, мы маглі шчыльна падыйсьці да вырашэньня задачы па калектывізацыі сельскае гаспадаркі. Таксама толькі ў змаганьні з нацыянал-дэмакратызмам, яго нацыянал-апартуністычнай агентурай унутры КП(б)Б, мы маглі правільна вырашаць пытаньні НАЦЫЯНАЛЬНАЙ ПАЛІТЫКІ ў складаных умовах нашай рэспублікі.

Партыя дасягнула бязумоўных посьпехаў у галіне нацыянальнай палітыкі. Актыўнае змаганьне за беларусізацыю, карэнізацыя кадраў, будаўніцтва беларускай пралетарскай культуры, забясьпячэньне нацыянальна - культурнага разьвіцьця ўсіх нацменшасьцяй, умацаваньне пралетарскага кіраўніцтва шырокімі сялянскімі масамі — усё гэта было магчыма толькі таму, што наша партыя непрымірыма змагалася з усімі нацыяналізмамі. Зусім відавочна, што нельга прызнаваць правільнасьць нацыянальнай палітыкі КП(б)Б і яе Цэнтральнага Камітэту і адначасова змазваць тыя посьпехі, якія мае партыя ў змаганьні з нацыяналізмамі і нацыянал-апартунізмам. У гэтым змаганьні наша КП(б)Б і яе Цэнтральны Камітэт пасьлядоўна і цьвёрда кіравалі сацыялістычным наступленьнем, у рашучым і жорсткім змаганьні наносілі адзін удар за другім па нацыяналістычным і шавіністычных элементах.

Партыя ў гэтым змаганьні ня спускалася на тармазох, а крок за крокам праводзіла бальшавіцкае змаганьне са скажэньнямі нацыянальнай палітыкі і з усімі канкрэтнымі носьбітамі нацыянал-дэмакратызму і нацыянал-апартунізму. Спрэчкі па дакладу ЦК не выпадкова аддалі пытаньням гэтага змаганьня выключную ўвагу. І зноў такі з выключнай аднадушнасьцю зьезд цалкам ухваліў усю палітычную лінію ЦК у гэтым пытаньні. Зьезд адобрыў змаганьне, якое правёў Цэнтральны Камітэт з памылкамі тав. Чарвякова, выступушага на зьезьдзе з прызнаньнем гэтых сваіх памылак.

У шматлікіх выступленьнях на зьезьдзе і рэзалюцыі самога зьезду востра падкрэсьліваецца, што барацьба з нацыянал-дэмакратызмам і нацыянал-апартунізмам павінна працягвацца з усёй сілай, бо толькі вядучы гэту барацьбу мы здолеем забясьпечыць і ў далейшым пасьпяховае разьвіцьцё і будаўніцтва сацыялістычнай Беларусі. Паасобныя выступленьні на самым зьезьдзе (у прыватнасьці выступленьне т. Штэйнмана) сыгналізуюць аб узмацненьні нацыяналістычных тэндэнцый і настрояў унутры нашай партыі. Гэта ўзмацненьне ідзе і па лініі актывізацыі беларускага нацыянал-апартунізму, і па лініі яўрэйскага шавінізму (спробы скарыстаць для нацыяналістычных наскокаў на партыю перагібы ў галіне нашай палітыкі ў мястэчках і г. д.), і па лініі польскага шавінізму. Зьезд адзначыў таксама значную актывізацыю вялікадзяржаўнага шавінізму, ЯКІ ЗЬЯЎЛЯЕЦЦА АСНОЎНАЙ ПЕРАШКОДАЙ, як гэта правільна адзначаў тав. Гей. НА ШЛЯХУ АХВАТУ ПРАЛЕТАРСКІМ КІРАЎНІЦТВАМ БУДАЎНІЦТВА БЕЛАРУСКАЙ ПРАЛЕТАРСКАЙ КУЛЬТУРЫ, НА ШЛЯХУ ЎЗМАЦНЕНЬНЯ ПРАЛЕТАРСКАГА КІРАЎНІЦТВА ШЫРОКІМІ СЯЛЯНСКІМІ МАСАМІ.

МАЦНЕЙ АГОНЬ ПА НАЦЫЯНАЛІЗМАХ, АКТЫЎНЕЙ ПАВЕСЬЦІ ЗМАГАНЬНЕ З НАЦЫЯНАЛ-АПАРТУНІЗМАМ — вось вывад з пастаноў зьезду, вось вывад, які можна зрабіць з тых спрэчак, якія разгортваліся на зьезьдзе па дакладу ЦК.

Разгортваючы гаспадарчае будаўніцтва Беларусі па лініі бурных тэмпаў індустрыялізацыі, па лініі калектывізацыі сельскае гаспадаркі, цьвёрда ажыцьцяўляючы ленінскую нацыянальную палітыку, мы будзем з посьпехам ісьці па шляху зьнішчэньня рэштак фактычнае няроўнасьці і будаваць калгасна-індустрыяльную, сацыялістычную Беларусь.

Бальшавікі заўсёды праяўлялі вялікую патрабоўнасьць да паасобных членаў партыйнага кіраўніцтва. Бальшавікі заўсёды праяўлялі і праяўляюць вялікую палітычную прынцыповасьць, калі гутарка ідзе аб паасобных памылках паасобных кіруючых таварышоў. Гэта зьяўляецца станоўчай адзнакай, гэта гаворыць аб палітычным росьце нашай партыі, і толькі абываталь і дробна-буржуазны палітыкан можа «ахаць» і зьдзіўляцца гэтай нашай бальшавіцкай непрымірымасьці ў адносінах да палітычных памылак. Партыя выпраўляла памылкі паасобных кіраўнікоў і крытыкавала іх. Лепшай рысай кожнага бальшавіка зьяўляецца хуткае прызнаньне памылкі і яе выпраўленьне на справе. Тав. Ленін ня раз гаварыў аб тым, што справа заключаецца ня ў тым, каб не рабіць памылак (не памыляецца толькі той, хто нічога ня робіць), а ў тым, каб іх рабіць менш, каб іх хутка выпраўляць і ў тым, — каб, вучачыся на гэтых памылках, не паўтараць іх.

Сакратар ЦК КП(б)Б, тав. Васілевіч, за ўвесь час сваёй кіраўнічай работы і ў прыватнасьці за пэрыяд ад XII да XIII зьезду КП(б)Б ажыцьцяўляў ПРАВІЛЬНУЮ ПАРТЫЙНУЮ ЛІНІЮ. Тав. Васілевіч быў адным з кіраўнікоў Цэнтральнага Камітэту, які актыўна змагаўся за лінію партыі, які актыўна змагаўся супроць правага і «левага» апартунізму, супроць нацыянал-апартунізму і нацыянал-дэмакратызму. Тыя паасобныя памылкі, якія былі дапушчаны ў практыцы работы, тыя паасобныя памылковыя фармулёўкі, якія мелі месца, тав. Васілевіч хутка і па-бальшавіцку выпраўляў і прызнаваў.

У крытыцы на зьезьдзе гэтых паасобных памылак т. Васілевіча былі дзьве плыні. Адна плынь крытыкі была здаровай, правільнай, якую трэба ўсяк падтрымліваць і разьвіваць. Гэта была сапраўды бальшавіцкая самакрытыка. Але была і нездаровая плынь у крытыцы паасобных памылак тав. Васілевіча, якая сьцірала грань паміж памылкамі т. Васілевіча і памылкамі тых таварышоў, якія мелі цэлую сыстэму праваапартуністычных поглядаў і ўстановак. Такая крытыка аб'ектыўна паслабляе ўдар па сапраўды-апартуністычных элементах. Нездаровым было тое, што паасобныя памылкі т. Васілевіча ўзводзіліся, калі не ў закончаную сыстэму, дык ва ўсякім выпадку — у пэўную тэндэнцыю, якая не адпавядае партыйным установкам. Гэта нездаровая плынь у крытыцы паасобных памылак т. Васілевіча на зьезьдзе атрымала належны адпор з боку зьезду. 23усім ясна, што гэтыя спробы аб'ектыўна, незалежна ад волі іх аўтараў, вялі няўхільна да наскокаў на тую правільную палітычную лінію, якая праводзілася Цэнтральным Камітэтам. Іменна таму, што зьезд ТАК палітычна расцаніў гэтыя спробы, іменна таму яны і былі спатканы ў штыхі партыйным зьездам.

Зьезд прадэманстраваў выключную СКАНСАЛІДАВАНАСЬЦЬ вакол свайго Цэнтральнага Камітэту. Зьезд паказаў, што ЖАЛЕЗНАЕ АДЗІНСТВА нашых радоў было і застаецца непахісным. Усякім спробам парушыць гэта адзінства, усякім спробам унесьці ў напружаную работу партыі па вырашэньні задач сацыялістычнага будаўніцтва нездаровыя элементы, ПАРТЫЯ ДАВАЛА І БУДЗЕ ДАВАЦЬ РАШУЧЫ АДПОР.

Выключнае адзінства і палітычная згуртаванасьць былі прадэманстраваны і тады, калі зьезд вырашаў і абмяркоўваў пытаньні аб прамысловасьці, калектывізацыі, работы прафсаюзаў і г. д. Па ўсіх гэтых пытаньнях зьезд ухваліў важнейшыя палітычныя рэзалюцыі, якія паказваюць асноўныя вехі нашай далейшай работы і змаганьня.

Перад нашай арганізацыяй зараз паўстае важнейшая і кардынальнейшая задача — прапрацаваць пастановы зьезду, зрабіць іх уласнасьцю самых шырокіх партыйных мас і пакласьці іх у аснову ўсёй нашай работы. На ўсіх ячэйках, ва ўсіх зьвеньнях нашай арганізацыі павінна пачацца шырокая папулярызацыя і работа над вывучэньнем пастаноў зьезду. Пастановы зьезду трэба пранесьці разам з гэтым у самыя шырокія масы рабочае клясы і бядняцка-сярэдняцкага сялянства.

Кожны член партыі павінен ведаць пастановы зьезду, кожны член партыі павінен на справе, на сваім вучастку работы цьвёрда і няхільна праводзіць у жыцьцё гэтыя пастановы.

З яснай пэрспэктывай, з яснай, цьвердай папітычнай лініяй — партыя наша пойдзе з новымі сіламі да перамог і пасьпяховага перамаганьня ўсіх труднасьцяй і перашкод.

XIII зьезд КП(б)Б

Рэзалюцыя зьезду па дакладу тав. Мануільскага аб рабоце ЦК УсеКП(б)

XIII зьезд Камуністычнай Партыі бальшавікоў Белрусі, заслухаўшы дакład т. Мануільскага, цалкам ухваляе палітычную лінію і арганізацыйную дзейнасьць Цэнтральнага Камітэту Ўсесаюзнай Камуністычнай Партыі (бальшавікоў).

XIII зьезд канстатуе, што за 2 з пал. гады, якія прайшлі з XV зьезду ЎсеКП(б), партыя, ня гледзячы на цэлы рад труднасьцяй зьнешняга і ўнутранага характару, дабілася пад правільным кіраўніцтвам Ленінскага Цэнтральнага Камітэту ЎсеКП(б) буйнейшых дасягненьняў ва ўсіх абсягах сацыялістычнага будаўніцтва і міжнароднай палітыкі.

Аналіз капіталістычнай сыстэмы і міжнароднага становішча, даны партыяй і Камінтэрнам, цалкам апраўдаўся.

За апошні пэрыяд мы маем факт быстрага разьвіцьця сусьветнага крызісу капіталістычнай гаспадаркі і абвастрэньне, як зьнешніх, так і ўнутраных супярэчнасьцяй капіталістычнай сыстэмы ў цэлым.

У выніку гэтага мы маем абвастрэньне клясавага змаганьня, шырокі пад'ём масавага рэвалюцыйнага руху рабочае клясы капіталістычных краёў і магутную хвалю рэвалюцыйных паўстаньняў у калёніях (Кітай, Індыя), якія ўсё больш становяцца пад сьцягі Камінтэрну.

У выніку гэтага крызісу і ўзмацненьня гаспадарчага становішча і пад'ёму сацыялістычнай прамысловасьці СССР яшчэ больш абвастрыліся супярэчнасьці між капіталістычным сьветам і Савецкім Саюзам.

Магутны рост сацыялістычных элементаў у Савецкім Саюзе выклікае шалёны націск і нянавісьць буржуазіі і сацыял-фашызму да краю будуючагася сацыялізму. З боку сусьветнага капіталізму ідзе энэргічная падрыхтоўка да ўзброенага нападу на СССР.

Аднак, правільная палітыка Цэнтральнага Камітэту, ня гледзячы на цяжкія ўмовы, забясьпечыла ўзмацненьне міжнароднай моцы СССР і яго ролі, як краю пралетарскай дыктатуры і вогнішча сусьветнай пралетарскай рэвалюцыі.

Мірная палітыка Савецкае ўлады, якая цьвёрда праводзілася за мінулы пэрыяд, узмацненьне баяздольнасьці Чырвонай арміі і гатоўнасьць рабочае клясы СССР і міжнароднага пралетарыяту абаранаць край будуючагася сацыялізму, забясьпечылі правал дэлага раду правакацыйных выступленьняў імпэрыялізму і яго агентаў (Кітайска-ўсходняя чыгунка, рад правакацый на Захадзе, спроба ўзарваць наша прадстаўніцтва ў Варшаве, крыжовы паход папы і г. д.). Адпор усім гэтым спробам паказаў агромністую згуртаванасьць вакол партыі шырокіх працоўных мас нашага Саюзу і моц Чырвонай арміі.

XIII зьезд КП(б)Б адзначае ўзмацненьне ўплыву і ролі нашых брацкіх партый у капіталістычных краёх, далейшыя посьпехі ў справе бальшавізацыі на аснове рашучага змаганьня з правымі, якія зьяўляюцца галоўнай небясьпекай на сучасным этапе, а таксама і з «левымі» апартуністычнымі элемэнтамі і прымірэнцтвам да іх у тэорыі і практыцы.

XIII зьезд ухваляе правільную дзейнасьць дэлегацыі ЎсеКП(б) у Камінтэрне і яе змаганьне за бальшавізацыю брацкіх кампартый.

Рашаючыя посьпехі ў выкананьні пляну вялікіх работ сацыялістычнага будаўніцтва, ва ўмовах абвостранага клясавага змаганьня і шалёнага супраціўленьня клясавага ворага, сьведчаць аб правільнасьці генэральнай лініі нашай партыі. Выкананьне і перавыкананьне пляну паказала, што пад правільным кіраўніцтвам ЦК партыі асноўная ўстаноўка на індустрыялізацыю нашага краю і сацыялістычную рэканструкцыю народнай гаспадаркі ў цэлым, асабліва тэмпы разьвіцьця цяжкай індустрыі і вытворства сродкаў вытворства, — зьяўляецца адзіна правільнай і дае поўную гарантыю таго, што задачы — дагнаць і перагнаць перадавыя ў тэхнічна-эканамічных адносінах капіталістычныя краі — будуць выкананы ў самыя кароткія гістарычныя тэрміны.

Установкі правых апартуністых, якія прапанавалі ўзяць арыентоўку на «вузкія месцы» і даказвалі немагчымасьць высокіх тэмпаў індустрыялізацыі і сацыялістычнай рэканструкцыі сельскай гаспадаркі, а таксама і прадраканьні трацкістых аб тым, што немагчыма пабудаваць сацыялізм у адным краі, аказаліся абвержанымі самім жыцьцём. Наперакор усякім прадраканьням, партыя дабілася за першыя два гады пяцігодкі ўзросту валавой прадукцыі плянуемай прамысловасьці на 65 проц. замест намечаных плянам 47 проц.; уся буйная прамысловасьць, якая плянуецца і не плянуецца, дала рост на 59 проц. замест 43 проц.; прадукцыя машынабудаўніцтва ўзрастае за два гады ў два з лішнім разы; электратэхнічная прамысловасьць узрастае ў 2,7 разы, прадукцыя с.-г. машын узрастае ў 3,5 разы; капітальныя ўкладаньні ўзрастаюць з 1.800 млн. да 4.000 млн. руб.

Адзначаючы вялікія дасягненьні ў абсягу сацыялістычнага будаўніцтва, XIII зьезд ня можа прайсьці міма тых паасобных прарываў у абсягу выкананьня прамфінпляну, асабліва па лініі выкананьня якасных паказальнікаў, якія пагражаюць ажыцьцяўленьню намечаных тэмпаў сацыялістычнай рэканструкцыі. Выходзячы з гэтага зьезд падкрэсьлівае важнасьць задачы мабілізацыі ўсёй партыі і рабочай клясы, прафсаюзных і гаспадарчых органаў на ліквідацыю меўшых месца прарываў, вядучы рашучае змаганьне за павышэньне якасьці прадукцыі, за зьнижэньне сабекошту, павышэньне прадукцыйнасьці працы, што можа быць з посьпехам вырашана пры ўцягненьні новых пластоў рабочых у сацспаборніцтва, ударныя брыгады, давядзеньне плянавых заданьняў да паасобных цэхаў і варштатаў і пасьлядоўнае правядзеньне прынцыпу адзіначальня.

Магутны рост сацыялістычнай індустрыі, павялічэньне яе ўдзельнай вагі і вядучай ролі ва ўсёй народнай гаспадарцы, забясьпечылі магчымасьць вырашэньня задачы, якое яшчэ ня бачыла ніколі гісторыя, — задачы сацыялістычнай рэканструкцыі ўсёй сельскай гаспадаркі. Рост буйных савецкіх гаспадарак, а таксама масавы добраахвотны ўваход у калектывы асноўнага пласта сялянства, — як беднякоў, так і сярэднякоў, — даў партыі магчымасьць паставіць і ў асноўным вырашыць задачу карэннага павароту сельскай гаспадаркі на рэйкі калектывізацыі і разам з гэтым перайсьці ад лёзунгу абмежаваньня і выцясьненьня кулацтва да лёзунгу ліквідацыі кулацтва, як клясы, на базе суцэльнай калектывізацыі. Шыроні размах калгасная руху, будаўніцтва буйных сельска-гаспадарчых фабрык — саўгасаў, ужываньне ў шырокіх разьмерах новай тэхнікі (трактары, камбайны) яшчэ раз абверглі і нанесьлі канчатковае паражэньне правым і «левым» апартуністым і далі магчымасьць пад правільным кіраўніцтвам ЦК УсеКП(б) зрабіць рашаючы паварот вёскі да сацыялізму.

Ня гледзячы на антысярэдняцкія перагібы і скажэньні лініі партыі, да пушчаныя радам партыйных арганізацый, таксама і ў КП(б)Б, у справе калгаснага будаўніцтва намечаны плян калектывізацыі на сёньня аказаўся значна перавыпаўненым, асабліва ў найважнейшых збожжавых раёнах (40-50 проц.).

XIII зьезд лічыць правільнымі і цалкам ухваляе пастановы ЦК УсеКП(б) і артыкулы т. Сталіна, якія своечасова папярэдзілі партыйныя арганізацыі ад рознага роду выкрыўленьняў у практыцы калгаснага будаўніцтва і правільна ўказалі недапушчальнасьць адміністраваньня і бюракратычных прыёмаў у справе калектывізацыі.

Праводзячы і надалей неаслабную работу па ўзмацненьні і расшырэньні сацыялістычнага сэктару сельскай гаспадаркі, зьезд разам з гэтым лічыць неабходным не аспабляць работы па ўзмацненьні кіруючай ролі пралетарыяту ў адносінах індывідуальнага сэктару сельскай гаспадаркі шляхам энэргічнага правядзеньня вытворчага каапэраваньня бядняцкіх і сярэдняцкіх гаспадарак, упартай і сыстэматычнай работы сярод беднаты, узмацненьня саюзу з сярэдняком і ўстанаўленьня правільных узаемадносін паміж калгасамі і індывідуальнікамі, усялякая дапамога калгасаў і саўгасаў бядняцка-сярэдняцкім гаспадаркам, што павінна забясьпечыць пасьпяховае правядзеньне лініі суцэльнай калектывізацыі і на яе аснове—ліквідацыю кулацтва, як клясы.

Асаблівую ўвагу зьезд адводзіць вырашэньню праблемы жывёлагадоўлі, якая павінна і можа быць поўнасьцю вырашана толькі ідучы па шляху буйной аграмаднай гаспадаркі.

Ленінская нацпалітыка ЦК УсеКП(б) забясьпечыла значнае падняцьце і ўзмацненьне эканамічнага і культурнага ўзроўню адсталых рэспублік і народаў СССР. За апошні пэрыяд у сувязі з бурным тэмпам рэканструкцыі гаспадаркі і ростам культурнага будаўніцтва яна дала асабліва выразныя выніні.

Яшчэ больш высокія тэмпы будаўніцтва, рост гаспадарки нацыянальных рэспублік, у тым ліку і БССР, рост пралетарскай праслойкі ў гэтых рэспубліках зьяўляюцца пепшымі доказамі правільнасьці гэтай палітыкі. Бурныя тэмпы будаўніцтва ў нацрэспубліках былі-б немагчымы без аказаньня дапамогі ім сіламі ўсяго СССР.

Усё гэта рашуча абвяргае ўстаноўкі нацыянал-апартуністых, адмаўляючыя тыя вялікія дасягненьні, якія мы маем у правядзеньні нацыянальнай палітыкі. Гэтыя дасягненьні таксама б'юць па нацыянал-дэмакратызьме, які зьяўляецца ідэалёгічным сьцягам буржуазіі, у першую чаргу адчайна супраціўляючагася кулацтва, робячага спробу павярнуць край са шляху сацыялізму на шлях буржуазнай рэстаўрацыі.

Гіганцкі рост індустрыі, вялікія посьпехі па ўсім фронце народнай гаспадаркі і пралетарскае культуры, выкананьне прамфінпляну пад правільным кіраўніцтвам ЦК УсеКП(б) далі магчымасьць партыі па-новаму паставіць пытаньне аб мэтадах работы і падняць да актыўнага ўдзелу ў сацыялістычным будаўніцтве новыя мільёны працоўных.

Вялікую ролю і значэньне на шляху да сацыялізму адыграла і мае ў далейшым адыграць разгортваньне бальшавіцкай самакрытыкі. Толькі на аснове вялікіх тэмпаў сацыялістычнага будаўніцтва, пры дапамозе самакрытыкі, пад правільным кіраўніцтвам ЦК УсеКП(б) можна было ўцягнуць у сацбудаўніцтва новыя мільёны працоўных, разгарнуць іх актыўнасьць, высунуць задачу перабудовы па-новаму работы прафсаюзаў і грамадзкіх арганізацый, стварыць новыя сац. мэтады працы пралетарыяту, выклікаць да жыцьця сотні тысяч ударных брыгад і разгарнуць сацспаборніцтва, прыступіць і разгарнуць работу рашучага высо

XIII зьезд КП(б)Б

Спрэчкі па справаздачы Цэнтральнага Камітэту КП(б)Б

Прамова тав. Сянкевіча

Таварышы, КП(б)Б пад кіраўніцтвам ЦК прарабіла вялізарнейшую работу на даным адказным этапе, калі мы ўступаем у новы апошні пэрыяд нашага НЭПу. Мы маем вялізарныя дасягненьні на фронце гаспадарчым, мы маем ня меншыя дасягненьні на фронце будаўніцтва культуры беларускіх працоўных мас і культуры нацменшасьцяй. КП(б)Б дала рашучы адпор праваму ўхілу, як галоўнай небясьпецы на даным этапе, «левым» загібам, КП(б)Б навяла і мабілізавала ўсю партыйную арганізацыю на барацьбу з беларускім нацыянал-дэмакратызмам і шавінізмам розных колераў, на барацьбу з нацыянал - апартунізмам. Значныя посьпехі мы маем у справе сацыялістычнай рэканструкцыі сельскай гаспадаркі.

13 проц. калектывізаванай зямельнай плошчы на сёнешні дзень супроць 2 проц., якія мы мелі да XII зьезду, зьяўляюцца вялікім дасягненьнем, складаюць падваліны для далейшых посьпехаў, для пераводу індывідуальнай гаспадаркі на калектыўную буйную гаспадарку.

Але, таварышы, калі мы ў працэсе дасягненьня гэтых 13 проц. спалі з 57 проц. да 13 проц., калі ў нас быў адсоў амаль на 40 проц. сялянскіх гаспадарак, гэты спад гаворыць аб тым, што ў справе калектывізацыі мы мелі вялізарныя прарывы.

Адміністраваньне, перагібы і памылкі ў справе калектывізацыі зьяўляюцца асабліва небясьпечнымі ў БССР, як краіне прымежнай, бо гэтыя перагібы лілі ваду на млын унутранога ворага — кулака, але яны скарыстоўваліся супорць нас і агентамі замежных краін. Сёньня мы павінны падрадкаваць глыбокаму аналізу ўсю праробленую работу на калектывізацыі, знайсьці крыніцы зробленых памылак і перагібаў, бо гэта дапаможа хутчэй перамагчы памылкі, хутчэй наладзіць патрэбную нам работу, якая дасьць магчымасьць далей з посьпехам разгортваць калектывізацыю.

Адной з асноўных прычын тых скрыўленьняў, якія мелі месца пры калектывізацыі, зьяўляецца слабая работа з беднатой, адсутнасьць сыстэматычнай палітвыхаваўчай работы з беднатой наогул і з групамі беднаты.

Не вялася ў нас барацьба са спажывецкімі, ураўнілаўскімі настроямі ў беднаце, з антысярадняцкімі настроямі сярод некаторай часткі беднаты. Мы бачылі, што гэтыя спажывецкія ўраўнілаўскія тэндэнцыі часта дамінавалі праз увесь працэс калектывізацыі, і ў справе раскулачваньня і пры арганізаваньні сродкаў вытворчасьці ўнутры калгасаў; гэтыя настроі былі галоўным стымулам перасковваньня ад хутара да камуны.

Другой прычынай, якая мае цесную сувязь з першай, у нашых перагібах зьяўляецца сацыяльны склад нашай вясковай арганізацыі. Перапіс, які быў праведзен у 1929 г., паказаў, што ў нашай вясковай арганізацыі пераважную частку складаюць сераднякі і ад 2 да 4 проц. нават кулакі. Зразумела, такі сацыяльны твар нашай вясковай арганізацыі ня можа не адбіцца на тых працэсах і на тэй рабоце, а таксама і на перагібах, якія ў нас былі. Адсюль наша ўвага павінна быць накіравана на паляпшэньне сацыяльнага складу вясковай арганізацыі, на ўцягваньне ў яе батракоў, беднаты і лепшых калгасьнікаў, каб яны складалі разам з рабочымі аснову вясковай арганізацыі. Гэта зьяўляецца першачарговай задачай.

Трэцяй ня менш важнай прычынай у нашых памылках зьяўляюцца навыкі адміністраваньня. У нас ва ўвесь пізаны апарат уелася клыбока псыхалёгія камандаваньня мужыком. Вось такое адміністраваньне нам трэба выпякаць калёным жалезам, бо яно ў паасобных мясцох адчуваецца і ў кіраўніцтве калгасамі.

Чацьвертай прычынай зьяўляецца нізкі тэарытычны ўзровень ня толькі нізавых актывістых, але і часткі кіруючых кадраў. Ні для кога не сакрэт, што ва многіх мясцох работа на калектывізацыі праводзілася пад лёзунгам «лепш перагнаць, чым недагнаць», каб не напасьці ў правы ўхіл. Мы мелі такое становішча, што некаторыя перагібшчыкі «ўлева» пасьля артыкулу тав. Сталіна шарахнуліся «ўправа». Гэта гаворыць аб тым, што гэтыя таварышы не сталі моцна на генэральнай лініі нашай партыі, яны не ведалі генэральнай лініі нашай партыі, ня ведалі асноў навукі Маркса — Леніна. Гэта павінна паставіць перад намі задачу далейшага марксыцка - ленінскага выхаваньня нашых кадраў. Мы ведаем, што гэта выхаваньне праводзіцца, галоўным чынам, у барацьбе з ухіламі ад генэральнай лініі партыі. У гэтай барацьбе партыя выхоўвала і загартоўвала кадры бальшавікоў, адначасова з узьняцьцем тэарытычнага ўзроўню партыйных кадраў, узброеньня іх тэорыяй.

Трэба сказаць, што партшкола, пачынаючы з камвузу і канчаючы нізавымі зьвеньнямі, пры вывучэньні асноў марксызму ленінізму, гісторыі партыі праводзіла сваю работу ў значнай меры схалястычным шляхам, адарвана ад жыцьця. Аб тым, як мы павінны выхоўваць партыйныя кадры, тав. ЛЕНІН пісаў паступнае: «Никогда массы не научатся вести политическую борьбу, покуда мы не поможем воспитаться руководителям этой борьбы и из интеллигентных рабочих и из интеллигентов. Воспитаться такие руководители могут исключительно на систематической текущей оценке всех сторон нашей политической жизни, всех попыток протеста и борьбы различных классов и по различным поводам». Уявляць тэарытычную вучобу з аценкай усіх зьявішч клясавай барацьбы сёньняшняга дня, знайсьці новыя формы работы, новыя формы вучобы — зьяўляецца абавязкам нашай арганізацыі і культпрацьветы. Асноўны недахоп у рабоце Культпропу ЦК і акруговых культпропаў той, што мы новыя формы работы, якія нашчуваюцца, ня можам пашырыць, паказаць і прышчапляць. Такія формы, як канфэрэнцыі - курсы партактыву, якія практыкаваліся ў Гомельскай і Фрунзаўскай арганізацыях ,павінны быць пашраны і прашчапіцца ва ўсіх нашых арганізацыях. Гэту форму курсаў-канфэрэнцый трэба праводзіць і ў вёсцы сярод вясковых камуністых і груп беднаты.

Нам зараз трэба паставіць рубам пытаньне аб кадрах на лініі партвучобы. Тое, што мы арганізавалі курсы прапагандыстых, што мы выпускаем 120-130 прапагандыстых, зьяўляецца каплямі ў моры, у асаблівасьці, калі мы паглядзім на тыя вялізарнейшыя кадры маладых камуністых, якія патрабуюць ленінскага выхаваньня. Камвуз дае нязначную колькасьць работнікаў. Адсюль пытаньне арганізацыі вячэрняга камвузу ня толькі ў Менску, але і ва ўсіх буйнейшых нашых цэнтрах, зьяўляецца нашай першачарговай задачай.

Далей я хачу спыніцца на пытаньні культурнай рэвалюцыі. Я лічу, што пытаньне культурнай рэвалюцыі зьвязана з пытаньнем сацыялістычнай рэканструкцыі нашай гаспадаркі, і таму павінна займаць значную ўвагу нашага зьезду. Таварышы, сацыялістычная рэканструкцыя нашай гаспадаркі ў першую чаргу патрабуе вялізарнейшых кадраў работнікаў як на лініі гаспадарчага будаўніцтва, так і па лініі культурнай рэвалюцыі.

ЦК заняўся гэтым пытаньнем і на адным з пленумаў вынес цэлы рад пастаноў, якія дапамогуць КП(б)Б справіцца з гэтай задачай, калі мы за яе рашуча возьмемся. Справа толькі ў тым, што яшчэ ня ўсюды і не ва ўсіх ёсьць належная ацэнка ўсёй важнасьці пытаньня аб кадрах.

Калектывізацыя сельскай гаспадаркі патрабуе пагалоўнай пісьменнасьці. На пісьменнасьці мы не набудуем сацыялізму. Але, як праходзіць у нас ліквідацыя пісьменнасьці. Таварышы, трэба прызнацца, што культурны паход, які мы пачалі ў мінулую восень, не правялі, як сьлед. Гэты культурны паход быў сарваны. Мы не ўцягнулі тысяч, дзесяткаў тысяч пралетарскіх мас у гэту справу, мы не мабілізавалі ўсёй пралетарскай грамадзкасьці на справу культурнага паходу, Наркамасьветы з гэтай задачай ня справіўся. Дарэмна тав. Платун тут ківаў на Культпроп, што ён сарваў яму ліквідацыю пісьменнасьці зацяжкай дэкрэту...

Справа ў тым, што той дэкрэт, які быў складзен НКАсьветы і прыслан на зацьвярджэньне ў ЦК, ён пераводзіць усю работу на ліквідацыі пісьменнасьці на адміністрацыйныя рэйкі.

Дазвольце мне прачытаць пару пунктаў гэтага дэкрэту: «прыцягваць да ліквідацыі пісьменнасьці ўсіх асоб ад 18 да 50 год, якія не пазбаўлены выбарчых правоў і маюць веды ў горадзе ня менш сямігодкі, а ў вёсцы ня менш чатырохгодкі Да гэтай работы прыцягваюцца таксама і асобы, якія маюць паказаныя вышэй веды ў абёме адпаведнай дарэвалюцыйнай школы». Далей, «на асоб, якія ўхіляюцца ад рэгістрацыі і ад ліквідацыі сваёй пісьменнасьці, могуць накладацца штрафы да 25 руб., а паасоб, якія маюць ны прымаць удзел у ліквідацыі пісьменнасьці, але ня прымаюць, паводле пастаноў саветаў, яны павінны штрафавацца ў разьмеры да 50 руб., або прымусовай працы да 1 м-ца».

Ніводнага слова аб прыцягненьні мас на падставе грамадзкасьці, аб сацыяборніцтве і г. д. Такая пастаноўка пры навыках адміністраваньня можа прывесьці да адміністрацыйнага націску ў справе ліквідацыі пісьменнасьці. Вось чаму Культпроп пераслаў гэты дэкрэт у НКАсьветы для пераапрацоўкі яго. Ён марынаваўся цэлы месяц і быў прысланы без усялякіх паправак у Культпроп.

Наша задача сёньня — усю нашу культработу перавесьці на рэйкі вытворчай прапаганды. Наша задача сёньня — перавесьці ўсю нашу культасьветную работу, пераключыць яе тварам да вытворчасьці.

Наша задач—стварыць такія органы асьветы, якія рсапаўды сталі-б штабамі нашай культурнай рэвалюцыі.

Дазвольце спыніцца таксама на тых спрэчках, якія ўзьніклі з поваду выступленьня наконт тав. Васілевіча. Адзін з выступаўшых таварышоў прабаваў давесьці ўсім зразумелае, што кожны член партыі мае права крытыкаваць членаў ЦК. Ніхто гэтага ніколі не адмаўляў.

Але ёсьць, як сказаў тав. СТАЛІН, здаровая крытыка, якая ідзе на карысьць партыі, і ёсьць крытыка, якая шкодзіць партыі. Калі мы возьмем некаторыя выступленьні наконт тав. ВАСІЛЕВІЧА. Які характар яны насілі? Выцягвалі факты і факцікі, выцягвалі іх з 1926-27 і іншых гадоў, выцягвалі няправільныя фармулёўкі, якія даўно ўжо тав. Васілевічам выпраўлены. Для чаго гэта патрэбна? Каму гэта патрэбна?

Аб тым, як мы павінны адносіцца да «фактаў і факцыкаў», тав. ЛЕНІН гаварыў наступнае: «В области общественной нет примера более распространенного и более несостоятельного, как выхватывание отдельных фактов. Подобрать примеры вообще не стоит никакого труда, но значение это имеем чисто отрицательное... Факты, если имеется возможность дать их целыми и в связи, то они не только упрямые, но и безусловно доказательная вещь. Факти ки если берутся вне целого и вне связи, являются игрушкой или чем-нибудь еще похуже».

Выцягвалі «факты і факцікі», але ніхто ня мог даць іх у цэлым і сувязі, бо ўсе адзначалі, як і я, з усёй рашучасьцю і зноў падкрэсьліваю гэта, што палітычная лінія тав. Васілевіча ў яго рабоце была ў асноўным правільнай. Было некалькі выступленьняў і кожнае з іх паўтарала адно другое.

Мы павінны вітаць здаровую самакрытыку паасобных таварышоў, але разам з усёй рашучасьцю трэба адкінуць крытыку нездаровую, крытыку ўгрунтаваную на імкненьнях беспадстаўна аб агуліць асобныя «факты і факцікі», на весьці цень, што яны кудысьці рассунуць... Такі сорт крытыкі шкодны яшчэ таму, што ён адцягвае ўвагу зьезду ад дзелавога абмеркаваньня важнейшых пытаньняў, якія стаяць у парадку дня зьезду.

Прамова тав. Будзінскага

Таварышы! КП(б)Б пад кіраўніцтвам свайго Цэнтральнага Камітэту і Цэнтральнага Камітэту УсесКП(б) прыйшла на зьезд з радам сур'ёзных палітычных дасягненьняў. Гэтыя дасягненьні ідуць у першую чаргу па лініі, якая ва ўмовах нацыянальнай рэспублікі, якою зьяўляецца БССР, мае найбольш важнае значэньне—па лініі змаганьня з нацыянал-апартунізмам унутры партыі і з беларускім нацыянал-дэмакратызмам па-за яе радамі. За гэты прыяд часу мы сапраўды ўзброіліся супроць праўленьняў правай небясьпекі на глебе нацыянальнага пераплёту, партыя ўзброена для змаганьня з нацыянал-апартунізмам і нацыянал-дэмакратызмам.

Я думаю, што не памылюся, калі ахарактарызую выступленьне тав. Вэйліна, як выступленьне надзвычай асьцярожнае і дыплёматычнае. Тав. Вэйлін эпоў гаварыў аб «адной сваёй памылцы», прычым эпоў прабаваў адчапіцца ад яснага абмеркаваньня сваіх памылак шляхам слоўнага прызнаньня фармулёвак, у якіх была вылажана пастанова бюро ЦК КП(б)Б аб памылках у галіне яўработы, і адмаўленьня яго сутнасьці. Мэтад яго самаабароны, якую ён выдае за самакрытыку, зводзіцца вось да чаго: «Мая памылка,—кажа Вэйлін, — была права-апартуністычнай, але, таварышы, гаварэце цішэй аб тым, што гэта памылка мела характар нацыянал-апартуністычны». І ўсё такі выступленьне тав. Вэйліна тут на зьезьдзе было ўсё такі крокам наперад параўнальна з яго выступленьнем на Менскай акруговай партканфэрэнцыі, дзе ён проста заявіў: «Так, у мяне была памылка, памылачка права-апартуністычнага характару, але мяне ніколі ні ЦК, ні ЦКК не называлі нацыянал-апартуністым».

Пытаньне-ж заключаецца ў тым, што права-апартуністычныя памылкі, калі яны робяцца на глебе, дзе мае месца пераплёт нацыянальных праблем, нацыянальных пытаньняў—гэтыя памылкі набываюць характар нацыянал-апартуністычны. Правільна, што ня кожны правы апартуністы зьяўляецца нацыянал-апартуністым. Але кожны нацыянал - апартуністы зьяўляецца права - апартуністым. Таму тав. Гей зусім меў рацыю ў сваім дакладзе і гэта яго «асабістае» тлумачэньне пастаноў бюро ЦК па пытаньні аб памылках т. Вэйліна павінна атрымаць рашучае падтрыманьне ўсяго зьезду, як яно ўжо атрымала падтрыманьне ва ўчарайшым выступленьні тав. Славінскага, які зусім правільна ахарактарызаваў памылкі тав. Вэйліна, як права-апартуністычныя і нацыянал-апартуністычныя.

Далей, я павінен спыніцца на выступленьні тав. Смаля дзэля таго, каб адмежавацца ад яго «крытыкі» памылак нашага друку. Зрабіць гэта я павінен таму, што ў далейшым затрымаюся на крытыцы памылак нашага друку і не хачу, каб неўтрунтаванае абвінавачаньне і сьцьвярджэньне тав. Смаля аб тым, што нашы газэты крытыкуюць, зважаючы на асобы, хаця-б ва ўскоснай форме, магло знайсьці нявольнае падтрыманьне з майго боку.

Тав. Смаль дагаварыўся да таго, што змаганьне з нацыянал-дэмакратызмам ЦК КП(б)Б пачаў весьці надта позна, ня гледзячы на сыгналы, якія своячасова даваў т. Смаль. Тав. Смаль забыў толькі адзін маленькі штрышок у гэтай справе, забыў пастановы XII зьезду РКП, якія мабілізавалі ўсю УсесКП(б), у тым ліку на тагачасным этапе і КП(б)Б на змаганьне з вялікадзяржаўным расійскім шавінізмам—галоўнай небясьпекай. Вы, тав. Смаль, забылі, што цэлы гістарычны прыяд наша КП(б)Б пад кіраўніцтвам ЦК УсесКП(б) змагалася з вялікадзяржаўным расійскім шавінізмам, які быў галоўнай перашкодай у справе правядзеньня ленінскай нацыянальнай палітыкі ў нашым краі і ўмацаваньня дыктатуры пралетарыяту. Я сьцьвярджаю, што партыя своячасова пераключыла ўдар на беларускі нацыянал-дэмакратызм, не забываючы ні на мінуту, як гэта зрабілі пасаобныя, вельмі прыткія барацьбіты з беларускім нацыянал-дэмакратызмам, аб неабходнасьці працягваць змаганьне з вялікадзяржаўным расійскім шавінізмам і шавінізмам усіх іншых масьцей. Тут я спыняюся на выступленьні тав. Аранштама. Мне здаецца зусім няўжытная фармулёўка, даная тав. Аранштамам, аб спуску на тармазох. Калі тав. Аранштам гэтай фармулёўкі ня выправіць, гутарка павінна ісьці не аб няправільнай фармулёўцы, а аб памылковым і неўгрунтаваным абвінавачаньні на адрасе ЦК. Партыя на тармазох у пытаньні змаганьня з нацыянал-дэмакратызмам ня спускалася, ня спускаўся і ЦК, бо што азначае спускацца на тармазох? Гэта азначае—ад простага змаганьня з беларускім нацыянал-дэмакратызмам пераходзіць да тых або і іншых форм прымірэнцтва з ім. Тав. Аранштам, напэўна, хацеў сказаць, што ЦК пасьля XII зьезду не разгарнуў такога тэмпу змаганьня з беларускім нацыянал-дэмакратызмам, які-б адпавядаў палкасьці і напружанасьці атакі XII зьезду на беларускі нацыянал-дэмакратызм, што ЦК не даволі хутка адпускаў тармазы ў змаганьні з беларускім нацыянал-дэмакратызмам пасьля XII зьезду партыі. Такая пастаноўка пытаньня зусім законная, хаця ня менш няправільная. У пытаньні змаганьня супроць нацыянал-дэмакратызму партыя і ЦК пасьля XII зьезду ў рэзультаце яго работ разгарнулі своячасова змаганьне з нацыянал-дэмакратызмам, аднак, партыя і ЦК не забывалі і не маглі забыць аб вялікадзяржаўным расійскім шавінізьме, аб шавінізмах іншага нацыянальнага афарбаваньня. І вось, прымаючы пад увагу гэтыя моманты, трэба прызнаць, што ЦК нашай партыі правільна і своячасова адпускаў тармазы ў справе змаганьня з беларускім нацыянал дэмакратызмам, правільна своячасова пераключаючы змаганьне з нацыяналізмамі наогул і вялікадзяржаўным расійскім у першую чаргу, на змаганьне з беларускім нацыянал-дэмакратызмам, як галоўнай небясьпекай на даным этапе ва ўмовах БССР. Вось гэта трэба бачыць, калі мы сёньня б'ем па беларускім нацыянал-дэмакратызьме, як галоўнай у нашых умовах небясьпецы і толькі пры гэтай умове мы не забудзем аб тым, што вялідзяржаўны расійскі шавінізм, што яўрэйскі, польскі шавінізм не зышлі са сцэны, што яны актуальны, хаця на даным этапе ва ўмовах БССР на сваёй небясьпецы для пралетарскай дыктатуры яны стаяць у тылу ў беларускага нацыянал-дэмакратызму.

Дазвольце мне, таварышы, цяпер перайсьці да пытаньня, якое выклікала тут на зьезьдзе шмат гарачых выступленьняў, да пытаньня, зьвязанага з прозьвішчам тав. Васілевіча. Я ня згодзен з тымі таварышамі, якія выходзяць на трыбуну і заяўляюць: ня трэба гаварыць аб памылках Васілевіча, або якія лічаць, што крытыка памылак тав. Васілевіча шкодная. Выбачце, таварышы, з гэтай установкай згадзіцца ніяк нельга, і я думаю, што першым ня згодзіцца з гэтай установкай сам тав. Васілевіч. Тав. Васілевіч—сакратар ЦК партыі, што-ж мы будзем накапляць яго асобныя памылкі, а вы, таварышы, ведаеце, што не памыляецца той, хто нічога ня робіць. А потым, калі накопіцца гэтых дробных памылак салідная колькасьць, хто-небудзь узьвядзе іх у лінію, а вы самі прадставіце рахунак. Гэта, на вашай думцы, абарона аўтарытэту бальшавіцкага кіраўніцтва нашай партыі? Не, лепш адразу адкрыта і сумленна паказаць асобныя памылкі для таго, каб іх выправіць. Але, таварышы, неабходна адна ўмова для таго, каб гэта крытыка асобных памылак і фармулёвак сакратара ЦК была карыснай для партыі. Неабходна зазначаць на асобныя памылкі, сказаць і падкрэсьліць сказанае, што асноўная лінія, якую праводзіў Васілевіч, была лініяй ЦК, была правільна. Скажэце: праводзячы ў вогуле і цэлым правільна лінію ЦК КП(б)Б, тав. Васілевіч, на жаль, меў тую ці іншую асобную памылку, раскрытыкуйце гэтыя памылкі, але рабеце гэта так, каб было ясна, дзе галоўная небясьпека, каб было ясна, што лінія, якую праводзіць т. Васілевіч, была правільнай партыйнай лініяй. Толькі тады сваёй крытыкай мы дапаможам і партыі і Васілевічу выправіць гэтыя асобныя памылкі, рухацца ўперад і расьці. Я лічу, што т. Васілевіч будзе надзвычай удзячны тым праз меру артадаксальным таварышом, якія ўзялі цытаты часоў 1926 г., бо, дзякуючы гэтаму, ў т. Васілевіча будзе аказія выправіць сваю прамову ў тэй яе часьці, дзе яна была памылкова, або нехайна і таму няправільна фармуляована, і паказаць, як некаторымі таварышамі ў палемічным захапленьні гэтыя месцы сказаліся і «ўскладніліся». Лічу, што неабходна таварыць нават аб дробных памылках кіруючых таварышоў, бо намечаная і нявыпраўленая драбніца можа даць у камэнтараў у работнікаў меншай кваліфікацыі вельмі нярымемныя вынікі. Неабходна, аднак, пры крытыцы дробных памылак гаварыць і аб лініі, ня змазваць таго факту, што лінія ў асноўным і цэлым была правільнай, лічу, што трэба голасна заявіць, што ў барацьбе з нацыянал-дэмакратызмам т. Васілевіч разам з ЦК вёў рэзкую і рашучаю барацьбу. Важна гэта ці не? Важна і вельмі. Таму аб гэтым трэба таксама сказаць. Лінію ЦК т. Васілевіч праводзіў і ў вогуле і цалкам правільна. Памылкі, якія тут крытыкаваліся, мелі месца, і іх трэ' было крытыкаваць, але так, каб і партыі, і Васілевічу дапамагчы, як ісьці далей, унікаючы гэтых памылак.

Нікому ня дана не памыляцца. І правільна ўчора аб гэтым сказаў т. Славінскі.

Пераходжу да пытаньняў друку. У гэтым абсягу мы маем сур'ёзныя дасягненьні. Мы дабіліся значнага арабочаньня і «камунізацыі» нашых радоў. Мы дабіліся таго, што наш друк страціў той налёт жаўтызны, які прыносілі ў яго журналісты з буржуазнымі традыцыямі і які ў свой час выразна адлюстраваўся ў газэце «Рабочий». Да рэчы, газэта «Рабочий» стала яшчэ больш партыйнай ня толькі па зьмесьце, але і на сваім тоне. У нашай актыў неабходна запісаць уцягненьне ў работу газэт больш шырокай рабкораўскай і селькораўскаў масы і некаторае, хаця і невыстарчальнае ажыўленьне рабкораўскай работы. Разам з тым у рабоце друку ёсьць сур'ёзныя недахопы. Аб іх больш усяго і буду гаварыць, але неабходна адзначыць і гэтыя дасягненьні. Увесь наш друк і цэнтральны, і правінцыяльны, і фабрычна-заводзкія шматтыражкі правільна біліся за генэральную лінію партыі пад кіраўніцтвам нашага ЦК. Але, таварышы, у гэтым змаганьні за правільную лінію партыі газэты дапусьцілі цэлы рад памылак, перагібаў, якія часамі прыводзілі нават да скрыўленьня і скажэньня партыйнай лініі. Я, таварышы, спынюся, галоўным чынам, на памылках па лініі калектывізацыі.

Лічу неабходным падкрэсьліць тое, што сказаў тав. Гей і з чаго трэба заўсёды пачынаць, а імення, што вялікзнай, буйнейшай заслугаў «Зьвязды», якая ў вогуле і цэлым правільна змагалася за лінію партыі, правільна праводзіла лінію партыі, зьяўляецца тое, што пад кіраўніцтвам ЦК КП(б)Б «Зьвяздой» разам з партыяй быў выкрыт і разгромлен нацыянальны апартунізм у радох нашай партыі і беларускі нацыянал-дэмакратызм. Аднак, калі пытаньне датычыць заслуг, дазвольце ў імя самакрытыкі сказаць пару слоў і аб недахопах. Пытаньне аб змаганьні і выкрыцьці яўрэйскага нацыянал-дэмакратызму і яўрэйскага нацыянал-апартунізму ў «Зьвязьдзе» не прайшло так гладка, як гэта патрабавалася. Першы артыкул па гэтым пытаньні патрабаваў уманьваньня з боку т. Васілевіча, які патрабаваў, каб «Зьвязда» ўдарыла мацней і каб «Зьвязда» ўдары накіравала правільней на канкрэтных посьбітах зла. У рэзультаце зьявілася другая заметка, якая выпраўляла, але не да канца, памылкі першага артыкулу. Зноў патрабавалася ўміньваньне тав. Васілевіча, у рэзультаце якога быў зьмешчан правільны артыкул па гэтым пытаньні.

Трэцяе, што трэба адзначыць, як мінус у нашым друку, гэта невыстарчальнае разьвіцьцё унутрызэзтнай самакрытыкі. У нас газэты амаль што не зварачаюць увагі на выпраўленьне памылак, якія маюць месца ў друку. На слупкох нашых газэт вы амаль ніколі не сустракаеце аглядаў друку. Гэта не азначае, што газэты адна другую не крытыкуюць. Аднак, гэта крытыка мае не заўсёды здаровы характар, і вядзецца ад правалу якой-небудзь газэты да наступнага правалу. Газэты часьцей за ўсё падхапляюць паасобныя дробныя ляпсусы адна ў другое, у той час, калі сур'ёзныя памылкі праходзяць міма іх увагі. Патрэбна сыстэматычная, сур'ёзная, вытрыманая, пастаўленая на досьць прынцыповую вышыню ўзаемакрытыка і ўзаемакантроль газэт. Акрамя таго, неабходна і самаправерка і самакрытыка кожнай газэты ў адносінах да самой сябе. Становішча, якое існуе з самакрытыкай газэт на сёнешні дзень, ні ў якім выпадку нельга прызнаць здавальняючым. Памылкі, дапушчаныя данай газэтай, сама газэта ня хоча і ня любіць прызнаваць, раскрытыкаваць, знайсьці іх карэньні, вытлумачыць чытачу правільную партыйную ўстаноўку, скажоную газэтай. Пад націскам яны могуць кацца, як гэта мы бачым на прыкладзе «Савецкай Беларусі», якая, крытыкуючы свае памылкі ў галіне калектывізацыі, з такой стараннасьцю каялася, што лоб сабе расшыбла. «Савецкая Беларусь» пісала, што яна праводзіла другую, чым партыя лінію. Гэта таварышы, паклён на сябе самую рэдакцыі «Савецкай Беларусі». Ніколі не магло быць у нашых умовах прапаганды другой антыпартыйнай лініі. Ні партыя, ні яе апараты, у тым ліку Культпроп ЦК не дапусьцілі-б, каб газэта праводзіла сваю асобную, розную, ідучую ў разрэз з лініяй партыі, палітычную лінію. «Савецкая Беларусь», як і ўвесь наш друк, па пытаньнях калектывізацыі праводзіла ў асноўным правільна генэральную лінію партыі. Пры правядзеньні генэральнай лініі партыі «Савецкая Беларусь», як і ўвесь наш друк, дапускала тыя ці іншыя памылкі, перагібы, няправільныя фармулёўкі і гэтым скажала, а часамі і перайначвала партыйную лінію. Вядома, такое раскаяньне, прыклад якога дала «Савецкая Беларусь», гэта не самакрытыка. Бальшавіцкая самакрытыка патрабуе прызнаньня сваіх памылак. Гэта, па-першае. А па-другое, бальшавіцкая самакрытыка патрабуе растлумачэньня у зразумелай, членападзельнай, але сугуба партыйнай форме крыніц і характару дапушчаных памылак, а таксама ўкараненьня ў сьвядомасьць чытачоў газэты правільнай партыйнай установкі, якая была скажона газэтай. Вось з такой бальшавіцкай самакрытыкай мы ў газэтах сустракаемся вельмі рэдка.

Возьмем другі прыклад: «Полесская Правда» «накачвае» гомельскую арганізацыю паведамленьнямі аб ходзе гомельскай акруговай партканфэрэнцыі. Па абавязку работы і я з гэтай крыніцы чэрпаю даныя аб работах і настроях гомельскай канфэрэнцыі і прыходжу ў жах. Чытаю і думаю: крытыкуюць ЦК бязьлітасна і за тое, што ЦК зрабіў, і за тое, чаго ён і ня думаў рабіць. Чакаю зубадрабіцельнай рэзалюцыі, накіраванай супроць ЦК. Атрымліваецца чацьверты ці пяты нумар «Полесской Правды», дзе была зьмешчана ўжо рэзалюцыя гомельскай акруговай партканфэрэнцыі і вачом ня веру: або гомельская канфэрэнцыя «здрэйфіла» і напісала рэзалюцыю, якая не адбівае ні ходу спрэчак, ні настрояў канфэрэнцыі, або газэта давала няправільнае асьвятленьне ходу канфэрэнцыі. У сапраўднасьці, вядома, аказалася, што канфэрэнцыя гомельскіх бальшавікоў прыняла рэзалюцыю, якая адбівае яе настрої, што выліліся ў спрэчках. «Полесская Правда» ўжо аказалася ў ролі дэзінфарматара і павінна была сваім чытачом вытлумачыць неадпаведнасьць паміж рэзалюцыяй і сваім асьвятленьнем ходу спрэчак у сумачным артыкуле. Усё як па нотах. Спачатку памылкі, потым самакрытыка (голас з месца: «а перадавая «Зьвязды»).

Дарагі таварыш, у даным выпадку пытаньне не ў памылках перадавой «Зьвязды», прысьвечанай ходу гомельскай партканфэрэнцыі. Трэба гаварыць аб першакрыніцы гэтай атруты, якая паслужыла прычынай і вашага самакрытычнага артыкулу і памылковых месц перадавой «Зьвязды». Ва ўсякім выпадку, крыніцай атруты была не «Зьвязда», якую ў даным канкрэтным выпадку трэба крытыкаваць за той ці іншы абзац перадавога артыкулу, а тая газэта, якая давала няправільную інфармацыю.

Таварышы, я, вядома, не заяўляю салідарнасьці з усімі палажэньнямі тэй перадавой «Зьвязды», аб якой ідзе гутарка, але я лічу, што неабходна ў даным канкрэтным выпадку больш моцна ўдарыць іменна па «Полесской Правде», і я думаю, што прыдзецца рабіць вывады з таго няпчасьці, якое прыключалася з рэдакцыяй «Полесской Правды» «кажный раз на эфтом самом месте: справа аб заціску самакрытыкі, паводзіны «Полесской Правды» ў пытаньні аб зьняцьці кіруючай галоўкі гомельскай арганізацыі, цяпер асьвятленьне канфэрэнцыі.

Лічу неабходным агаварыцца, што крытыкуючы жорстка гэтыя памылкі «Полесской Правды», я раблю гэта для таго, каб і «Полесская Правда» магла ўзьняцца на больш высокую ступень і ўвесь наш друк на вопыце «Полесской Правды» сяму-таму навучыўся. Неабходна, урэшце, спыніцца і на нашым цэнтральным органе—на газэце «Зьвязда».

«Зьвязда», як правільна гаворыць рэзалюцыя бюро ЦК ад 17-га красавіка, «пры правільнай у асноўным лініі» дапусьціла асобныя няправільныя ўстаноўкі ў галіне барацьбы за калектывізацыю, прычым неабходна падкрэсьліць, што рэдакцыя газэты «Зьвязда» надзвычай хваравита ўспрымае патрабаньні выпраўленьня сваіх памылак і разгортваньне самакрытыкі. Рэдакцыя «Зьвязды» заяўляе, што яна выправіла і прызнала свае памылкі: «адразу пасьля артыкулу т. Сталіна». Гэта няправільна. На сакавіцкім пленуме ЦК рэдактар газэты «Зьвязда» т. Асьмоў выступіў супроць т. Славінскага з грамавой прамовай, цьвердзячы, што тав. Славінскі свае бязумоўна ўгрунтаваныя абвінавачаньні па адрасе «Зьвязды» высмактаў з пальца. Тав. Асьмоў у вельмі самаўпэўненай прамове заявіў, што за выключэньнем аднаго няправільнага загалоўку, які пры гэтым, нібы, не адказваў зьместу артыкулу, усё у «Зьвязьдзе» было ў поўным парадку. Фармулёўку аб ліквідацыі эксплёататарскіх клясаў у горадзе і вёсцы тав. Асьмоў зацімуў маскоўскай часопісі «Бальшавік», не разумеючы, што нават у тым выпадку, калі першакрыніцай быў-бы і «Бальшавік»—гэта ні па ёту не зьмяняе палітычнай адказнасьці рэдакцыі «Зьвязды». Тав. Асьмоў не абмежаваўся выступленьнем на пленуме, але прамову сваю амаль поўнасьцю апублікаваў у газэтах.

Гэта было ўсугубленьнем яго памылкі, бо т. Славінскі правільна гаварыў аб памылках «Зьвязды», грунтуючыся на праверэных фактах. Толькі пасьля пастановы ЦК ад 17-га красавіка «Зьвязда» пачала крок за крокам, порцыямі прызнаваць дапушчаныя асобныя памылкі ў справе калектывізацыі. У вогуле трэба падкрэсьліць хваравітую самаўпэўненасьць кіруючых работнікаў «Зьвязды». «Зьвязда» раскрытыкавала памылковы артыкул Горына, зьмешчаны ў «Чырвонай Зьмене». У сваёй крытыцы, аднак, «Зьвязда» сама дапусьціла сур'ёзныя памылкі. Так што прышлося ў наступным нумары «Зьвязды» давець выпраўляючы артыкул. Калі газэта «Правда» ўдарыла па рэдакцыі «Прэсклішэ», якая разаслала правінцыяльнаму нашаму друку артыкул Горына, «Зьвязда» аб гэтым факце дала трацюю заметку: «Ня трэба блытаць». У гэтай заметцы і прышісцы ад рэдакцыі «Зьвязды», работнікі «Зьвязды» самазадоволена заяўляюць: «Зьмяшчаючы артыкул «Правды» «Ня трэба блытаць», рэдакцыя «Зьвязды» адзначае, што артыкул Горына «Бяз панікі і перагібаў» быў у свой час раскрытыкаваны ў «Зьвязьдзе» ў артыкуле т. С. М. «За правільную пастаноўку пытаньня» і «Аб двох лёзунгах». Гэтым рэдакцыя «Зьвязды» канчае сваю заўвагу і ні слова ня піша, што «Ня трэба блытаць»—загалавак у заметцы «Правда» адносіцца да пэўнай ступені і да «Зьвязды».

Рэдакцыя «Зьвязды» лічыць патрэбным, калі ўжо ЦК прымушае прызнаваць дапушчаныя асобныя памылкі, ня піраць на тое, што «Зьвязда» гэтыя памылкі прызнала і раскрытыкавала сваёй часова. Тут мы сустракаемся проста з курʼёзнымі анэкдотамі. На адной акруговай партыйнай канфэрэнцыі, калі мяць мне не зьмяняе, на віцебскай, быццам прынята рэзалюцыя, што «Зьвязда» не правільным у вогуле і ў цэлым правільнай лініі партыі, мела асобныя памылкі, якія былі «Зьвяздой» выпраўлены. Так напісана ў органе акругкому, здасьця, у «Віцебскім Пралетары». У «Зьвязьдзе»-ж гэта рэзалюцыя надрукавана з дабаўленьнем слова «своячасова выпраўлена». У «Віцебскім Пралетары» гэта рэзалюцыя зьмешчана бяз слова «своячасова», а ў «Зьвязьдзе» са словам «своячасова». Мне здаецца, што гэта невыпадкова, што ў супраціўніка «Зьвязды» гэта ўстаўка пры дапаўненьні па тэлефону ці пры стылістычнай выпраўленьні арыгіналу, атрымалася бесьсьвядома. Такая ўжо ўстаноўка рэдакцыі.

Я, таварышы, гавары

БССР адыгрывае вялікую ролю ў вырашэньні праблемы жывелагадоўлі

Сьвінягадоўля павінна быць пастаўлена ў цэнтр увагі нашых партыйных і савецкіх арганізацый

Неадкладна зьнішчыць тормазы, якія перашкаджаюць будаўніцтву сьвіняводных саўгасаў

Вынікі першае бальшавіцкае вясны 1930 году паказваюць, што на аснове масавай калектывізацыі бядняцка-серадняцкіх мас вёскі і вялічэзнага размаху будаўніцтва саўгасаў, як базы для сацыялістычнае перабудовы сельскае гаспадаркі, партыі удалося дабіцца радыкальных посьпехаў у справе вырашэньня аднэй з найбольш цяжкіх задач на шляху перабудовы сельскае гаспадаркі — збожжавай праблемы.

Зараз асноўная задачай зьяўляецца замацаваньне дасягнутых посьпехаў, дасягнутае наступленьне ў гэтай галіне. Гарговым зьвяном зьяўляецца праблема жывёлагадоўлі, у прыватнасьці праблема мяса, яна на сёньняшні дзень — адна з найбольш вузкіх месц у нашай гаспадарцы.

Вырашэньне мясной праблемы павінна найсьці на шляху фарсаванага разгортваньня спецыяльных саўгасаў, у прыватнасьці сьвіняводных і разьвіцьця сьвінягадоўлі ў калгасах і індывідуальных бядняцка-серадняцкіх гаспадарках. Ды чым неабходна перанесьці цалкам увесь вопыт і мэтады работы, якія жывіліся ў справе вырашэньня збожжавай праблемы. Пры арганізацыі сьвіняводных саўгасаў павінны ўжывацца этады аналёгічныя тым, якія ўжываліся пры стваральні збожжавых саўгасаў.

Трэба абвясьціць рашучую барацьбу сякага роду права-апартуністычным ахтоцкім і «тэорыям», з якімі ўжо зараз прыходзіцца сустракацца на практыцы работы, накшталт таго, што: сьвіньні родзяцца ня з яек, а ад матак, якіх парэзалі», «няма ў нас практыі арганізацыі буйных сьвіняводных гаспадарак», «няма спэцыялістых» і г. д.

Рашуча павінна быць пастаўлена пытаньне аб кіраўнічых і тэхнічных кадрах. Неабходна вылучыць лепшых прадгаўнікоў партыі і рабочай клясы на гэты фронт таксама, як былі вылучаны на фронт будаўніцтва збожжавых саўгасаў лепшыя работнікі і лепшыя спэцыялісты сельскае гаспадаркі.

Мэтады работы ў будаўніцтве сьвіняводных саўгасаў павінны быць каэнным чынам зьменены. Старыя «сельрэстаўскія», азіяцкія мэтады павінны быць неадкладна выкарчаваны з корасм. Патрэбны бальшавіцкі зрух у раэце, рашучасьць, шпаркасьць, выразасьць, уменьне запаліць энтузіязм мас.

Трэба мабілізаваць усю савецкую грамадзкасьць вакол вырашэньня гэтай праблемы, заклікаўшы яе да практычнага ўдзелу ў справе будаўніцтва сацыялістычнага жывёлаводзтва.

Гэта асноўныя прадпасылкі, якія павінны быць створаны неадкладна.

Якія практычныя задачы стаяць перад партыйнай арганізацыяй і працоўнымі масамі БССР?

ЦК УсеКП(б) зацьвердзіў на 1930-31 год вытворчую праграму разьвіцьця сьвінягадоўлі па лініі Сьвіняводтрэсту ў аб'ёме ня менш 400 тыс. галоў таварных сьвіней, на 31-32 год — 3 міл. галоў, на 1932-33 г. — 7 міл. галоў. У 1930-31 г. укладаецца толькі па лініі сьвіняводтрэсту да 300 міл. руб. на разьвіцьцё старых і будаўніцтва новых саўгасаў. Будаўніцтва новых саўгасаў вызначаецца ў ліку 300, з якіх на долю БССР прыпадае 50. Наогул Беларусь у 1930-31 годзе будзе мець 109 сьвіняводных саўгасаў, г. зн. зойме другое месца пасьля Украіны ў справе разьвіцьця сьвіняводных саўгасаў і атрымае 15-18 міл. руб. новых укладаньняў у сельскую гаспадарку і г. д. Адсюль становіцца зусім ясная тая вялічэзная задача і адказнасьць, што стаіць перад партыяй і працоўнымі масамі Беларускай Савецкай Рэспублікі.

Першае. Трэба забясьпечыць выкананьне пастаўленай цэнтрам задачы па камплектаваньні матачным складам існуючай сеткі сьвіняводных саўгасаў у колькасьці 15 тыс. матак таварнага значэньня і 1.000 галоў чыстакроўнага т. зв. элітнага матар'ялу. Скончыць гэту работу не пазьней 5 ліпеня г. г. Неадкладна абавязаць Белмяса, на аснове генэральнага дагавору Саюзмяса і Сьвіняводтрэсту, забясьпечыць здачу гэтай колькасьці сьвіней у паказаны тэрмін. Рашуча ўдарыць па руках работнікаў Белмяса, якія стараюцца ўмыць рукі, перакладаючы свае абавязкі на загатоўшчыкаў. Неадкладна падпісаць лёкальны дагавор і забясьпечыць яго выкананьне да паказанага тэрміну. Неадкладна ўлічыць сапраўдную наяўнасьць сьвіней на загатоўчых і адкормачных пунктах. Праверыць ход кантрактацыі сьвіней і кінуць сілы на яе ўзмацненьне, узмацніўшы таксама загатоўку.

Па лініі Сьвіняводтрэсту трэба ў бліжэйшыя 3-4 дні арганізаваць прыёмачныя і карантынныя пункты для сьвіней. Ні адна галава не павінна трапіць у саўгасы, не пабыўшы ў карантыне. Ухіленьне ад гэтага павінна разглядацца як яўная шкодніцтва, бо запесьці хваробу сьвіней ў буйны гурт—значыць яго зьнішчыць.

Трэба забясьпечыць будаўніцтва, каб разьмясьціць гурты ў адпаведных пабудовах, бо нельга трымаць пад адкрытым небам тысячы сьвіней. У гэтых адносінах справа стаіць вельмі дрэнна. 4-мільённае будаўніцтва гэтага году ў саўгасах Сьвіняводтрэсту ў БССР знаходзіцца ў бяспрытульным стане. Белсавкагасбуд адмовіўся ўзяць на сябе будаўніцтва ў саўгасах, а беларуская кантора Сьвіняводтрэсту ня мае ні аднаго спэцыялістага, нават тэхніка. Зразумела, што будаўніцтва будзе сарвана пры такім становішчы. Будаўніцтва павінна быць неадкладна забясьпечана спэцыялістымі і даручана спэцыяльнай арганізацыі, хаця-б за кошт сіл, якія працуюць у горадзе. Гэта магчымасьць ёсьць.

Другое. Трэба скончыць прыёмку ўсіх саўгасаў вызначаных Сьвіняводтрэсту і прыступіць да ўпарадкаваньня іх тэрыторыі. Неабходна павялічыць тэрыторыю саўгасаў за лік прырэзкі ім новых зямель і зараз-жа прыступіць да падрыхтоўкі тэрыторыі для новых 50 саўгасаў, усклаўшы гэту справу на зямельныя органы і мясцовыя акруговыя і раённыя выканаўчыя камітэты.

Становішча з кадрамі для саўгасаў катастрафічнае. Большасьць дырэктароў ня мае абсалютна ніякай падрыхтоўкі.

Трэцяе. Са спэцыялістымі яшчэ горш. На 55 саўгасаў ёсьць 18 зоатэхнікаў, з якіх частка таксама маласпрактыкаваных. Не хапае 37 чалавек. На 55 саўгасаў ёсьць 1 вэтдоктар і ні аднаго фэльчара. Ясна, што пры такой колькасьці спэцыялістых добрых саўгасаў ня збудуеш.

Арганізацыі БССР павінны забясьпечыць саўгасы кадрамі. Папершае, трэба зараз-жа мабілізаваць 40-45 чалавек лепшых камуністых, з якіх 20-25 павінны быць пасланы на падрыхтоўку, а іншыя — пасланы ў саўгасы. Зараз-жа запрасіць 35-40 вэтдактароў і каля 70 вэтфэльчароў. Гэта магчымасьць ёсьць: кінуць у саўгасы выпускнікоў віцебскага інстытуту (30-35 чалавек), зьняць усіх працуючых не на спэцыяльнасьці. Трэба зараз-жа накіраваць у саўгасы ня менш 37 зоатэхнікаў, зьняўшы працуючых у мясазагатоўчых арганізацыях і ня менш 12-14 чалавек працуючых у земорганах. У часьці забесьпячэньня зоатэхнікамі, само сабой зразумела, без дапамогі цэнтру абыйсьціся ня ўдасца. Цэнтрам ужо прымаюцца меры.

Чацьвертае. Трэба мабілізаваць грамадзкую думку вакол гэтых мерапрыемстваў і вакол будаўніцтва саўгасаў. Друк тут павінен адыграць вялікую ролю. Вялікая роля ляжыць на камсамоле. Ён павінен стаяць у першых радох на гэтым фронце.

Мэтазгодна арганізаваць пры ЦВК БССР камітэт садзейнасьці будаўніцтву сьвіняводных саўгасаў і разьвіцьцю сьвінягадоўлі.

Я. І. ПАЎЛЕНКА.

ПЕРАВЫБАРЫ ФАБЗАЎКОМАЎ

У Бабруйску кампанія можа быць праваленa

гэта выявіў рабкораўскі „налет" на прадпрыемствы

Рабкораўскі «налёт» на фабзаўкомы Бабруйску з мэтай праверкі падрыхтоўкі да справаздачна-перавыбарчай кампаніі выявіў шмат недахопаў.

На большасьці прадпрыемстваў вакол кампаніі не мабілізавана грамадзкая думка. На лесазаводзе № 7 у ячэйцы і заўкоме яўна дэмабілізацыйны настрой. Сакратар ячэйкі заявіў «налётчыкам»: «няма часу займацца перавыбарамі, мы заняты ліквідацыяй вытворчых прарываў».

Заўком заводу імя Адзярыха абмежаваўся толькі разглядам пытаньня аб перавыбарах на пасяджэньні заўкому. Ні лёзунгаў, ні насьценгазэты дагэтуль няма. Лёзунгаў і плякатаў, прысьвечаных перавыбарам, няма таксама на броварах, бойні і інш.

На радзе прадпрыемстваў вельмі слаба абстаіць справа з уцягненьнем рабочых у праверачныя брыгады. У фанэрным цэху камбінату ў брыгады запісалася 25 чалавек (а рабочых усяго 530), у лесацэху—14 чалавек (рабочых каля 400), на электрастанцыі—усяго 3 чалавекі. На заводзе № 7 у праверачныя брыгады запісалася 7 чалавек, але і яны нічога ня робяць.

Ракорд бюракратызму пабіў групком цэрабкопу. Замест брыгады добраахвотнікаў ён арганізаваў... КАМІСІЮ ПА ПАДРЫХТОЎЦЫ ЛЁЗУНГАЎ (якіх, да рэчы, дагэтуль няма).

Культмасавая работа вакол кампаніі разгорнута слаба. Клюбы бязьдзейнічаюць. Клюб саўгандальслужачых спасылаецца на рамонт, а таму нічога ня робіць для дапамогі чырвоным кутком.

Насьценны друк амаль ніякага ўдзелу ў кампаніі ня прымае. На радзе прадпрыемстваў насьценгазэты нават ня выпушчаны. Як добры прыклад, трэба адзначыць фанэрны цэх камбінату, дзе арганізавана рабкораўская брыгада, якая рэгулярна асьвятляе перавыбарчую кампанію ў насьценгазэце і зьбірае рабочыя прапановы.

Справаздачы заўкому ня ўсюды вывешаны. У некаторых мясцох (камбінат) справаздача вывешана бяз усякіх разьдзелаў, хоць і займае чатыры лісты густога машыновага шрыфту.

Толькі на некаторых прадпрыемствах кампанія пачата больш-менш добра. На лесазаводзе № 6 25 проц. рабочых запісался ў праверачныя брыгады. На шчацінным фабрыцы рабочыя шырока азнаёмлены з задачамі кампаніі, якая цесна ўвязваецца з выкананьнем прамфінпляну. На камбінаванай фабрыцы пытаньне аб перавыбарах папулярызавана на рабочым сходзе і вытворчым вечары. Але гэтыя фабрыкі—адзіныя. На БОЛЬШАСЬЦІ прадпрыемстваў яшчэ не разварушыліся.

А. МАГІДАЎ.

НАМ ПЕРАДАЮЦЬ З МАСКВЫ

(ПА ТЭЛЕФОНУ АД НАШАГА КАРЭСПАНДЭНТА)

ДА ВЫДАНЬНЯ ЎЛ. ІЛ. ЛЕНІНА НА БЕЛАРУСКАЙ МОВЕ

МАСКВА, 13. НКФ СССР асыгнаваў Беларускарэвыдавецтву датацыю на выпуск патаненага выданьня збору твораў Ул. Іл. Леніна на беларускай мове. Пры гэтым НКФ ставіць умовай, каб плян гэтага выданьня быў узгоднены з Інстытутам Леніна. Датацыя выдаецца на суму фактычнай розьніцы паміж сабекоштам і яго прадажнай цаной.

ДРЭВААПРАЦОЎЧЫ КАМБІНАТ У ПОЛАЦКУ

У пяцігадовым пляне будаўніцтва беларускай прамысловасьці прадугледжана пабудова дрэвааапрацоўчага камбінату ў Полацку. У сувязі з тым, што абсьледваньне паказала невыстарчальнасьць сыр'ёвай базы Полацкага раёну для здаваленьня патрэб гэтага камбінату, у СПА пастаўлена пытаньне аб прымацаваньні да Полацкага раёну лясоў, якія знаходзяцца на тэрыторыі РСФСР.

АДЗІН МІЛЬЯРД НА ЭЛЕКТРЫФІКАЦЫЮ

Паводле меркаваньняў Дзяржпляну СССР на капітальныя работы ў галіне электрыфікацыі ў 1930-31 годзе будзе ўложана звыш аднаго мільярду руб., з іх 867 млн. руб. на раённыя станцыі і 75 млн. руб. на вясковыя.

Акрамя вызначаных раней станцый мяркуецца ў 1930-31 годзе пабудаваць яшчэ 7 раённых электрастанцый, у тым ліку Клінцаўскую (для Заходняй вобласьці) і Гомельскую.

408 СЬВІНАВОДЧЫХ ГАСПАДАРАК НА БЕЛАРУСІ

У бягучым годзе ў БССР павінна быць арганізавана 349 буйных сьвіняводчых гаспадарак у калгасах і 59 у саўгасах. Для гэтага будаўніцтва не хапае матар'ялаў. У сувязі з гэтым НКЗ СССР адпусьціў для БССР дадаткова 5.500 бочак цэмэнту, 240 тон цьвікоў і 350 тон дахавага жалеза.

Адначасова з сьвіняводчымі гаспадаркамі павінна быць створана 12 малочных фэрмаў.

НАПЯРЭДАДНІ ЎСЕСАЮЗНАЙ АЛІМПІЯДЫ ТЭАТРАЎ

Фактычна алімпіяда тэатраў ужо пачалася спэктаклем грузінскага тэатру імя Руставэлі і ўзбэкскае дзяржпрамы. Аднак, афіцыйнае ўрачыстае адкрыцьцё адбудзецца 15-га чэрвеня ў тэатры Рэвалюцыі.

Для дэлегатаў XVI партзьезду будзе арганізаваны спэцыяльны вечар-канцэрт з удзелам працаўнікоў усіх опаборнічаючых тэатраў.

14-га чэрвеня чакаецца прыезд у Маскву Белдзяржтэатру.

Да дня адкрыцьця алімпіяды дзяржвыдавецтва выпускае спэцыяльную брашуру, прысьвечаную ўдзельнікам алімпіяды. Брашура друкуецца па расійскай, нямецкай і ангельскай мовах.

УсеЦСПС АБ ІНЖЫНЭРНА-ТЭХНІЧНЫХ СЭКЦЫЯХ

Прэзыдыум УсеЦСПС пастанавіў лічыць нямэтазгоднай ліквідацыю інжынэрна-тэхнічных сэкцый.

Ударнымі тэмпамі правесьці асеньнюю пасеўную кампанію

Увосень аб'яднаць у калгасах 20 проц. бядняцка-серадняцкіх гаспадарак БССР

Пастанова праўленьня Белкалгасцэнтру аб уборачнай і асеньняй пасеўнай кампаніі

Выходзячы з задачы выкананьня пяцігодкі за чатыры гады і калектывізацыі да канца пяцігодкі асноўных мас бядняцка-серадняцкіх гаспадарак, а таксама грунтуючыся на папярэдніх выніках першага паўгодзьдзя 1929-30 г. у галіне калгасна-каапэрацыйнага будаўніцтва, у аснову пляну асеньняй пасеўнай кампаніі 1930 г. пакласьці наступныя задачы:

а) арганізацыйна-гаспадарчае замацаваньне існуючых калгасаў;

б) далейшая калектывізацыя бядняцка-серадняцкіх сялянскіх гаспадарак з тым, каб увосень 1930 г. аб'яднаць у калгасы каля 20 проц. усіх бядняцка-серадняцкіх гаспадарак;

в) разгортваньне работы па вытворчым каапэраваньні індывідуальных сялянскіх гаспадарак з разьлікам на ахоп сеткай вытворчых т-ваў 85 проц. бядняцка-серадняцкіх сялянскіх гаспадарак, не ўвайшоўшых у калгасы;

г) арганізацыя плянавага і сваячасовага пасеву азімых культур і ворыва пад зяб;

д) правядзеньне мерапрыемстваў, забясьпечваючых пашырэньне пасеўнай плошчы на 1930-31 г. на 14 проц. за кошт распашкі бросавых зямель, а таксама за кошт зьмяншэньня плошчы папароў;

е) уздым ураджайнасьці азімых у калгасах на 6-10 проц. у параўнаньні з мінулым годам;

ж) плянавае і сваячасовае правядзеньне ўборачнай кампаніі;

з) усямернае стымуляваньне разьвіцьця жывёлагадоўлі і правядзеньне раду буйных мерапрыемстваў па ўтварэньні кармавой базы.

Ажыцьцяўленьне намечаных задач павінна ісьці на пляху пырокага ўцягненьня ў работу па правядзеньні асеньняй пасеўнай кампаніі ўсіх савецкіх і грамадзкіх устаноў, на падставе рашучай і бязьлітаснай барацьбы са скрыўленьнямі, перагібамі і адміністраваньнем, дапушчанымі ў часе веснавой пасеўнай кампаніі.

Выходзячы з гэтых задач, плян мерапрыемстваў, якія забясьпечваюць іх выкананьне ў часе асеньняй пасеўнай кампаніі, прыняць у наступных разьмерах:

I. У галіне арганізацыі сеткі калгасаў і вытворчых таварыстваў

а) Запраектаваць павялічэньне: з вясны на восень 1930 г. колькасьць калгасаў з 3.080 да 3.586 пры сярэднім разьмеры калгасу на восень 1930 г. каля 280 гэкт.

б) Прыняць павялічэньне колькасьці калектывізацыі бядняцка-серадняцкіх двароў з 88.000 да 158.100, або 20 проц. ад усіх бядняцка-серадняцкіх гаспадарак на восень 1930 г.

в) Плошчу пахаці пад калгасамі давесьці з 699.550 да 1.054 тыс. гэкт., што на восень 1930 г. складае 23 проц. ад усяе пахаці БССР.

г) Адпаведна гэтаму плошчу азімых культур у калгасах запраектаваць у 288,9 гэкт., або каля 20 проц. агульнай пасеўнай плошчы азімых па БССР.

д) Ахапіць сеткай першапачатковых вытворчых т-ваў да 509.600 бядняцка-серадняцкіх сялянскіх двароў, з іх 259.000 па сыстэме папяводчай каапэрацыі, 220 тыс. па сыстэме жывёлагадоўчай каапэрацыі і 30.000 па садова-гароднай каапэрацыі пры сярэднім разьмеры вытворчага таварыства ў 100 сялянскіх двароў.

II. У галіне агрыкультурных мерапрыемстваў

У мэтах поўнага выкананьня задач падняцьця ўраджайнасьці азімых культур на калгасах на 8-10 проц. у параўнаньні з мінулым годам, запраектаваць правядзеньне наступных мерапрыемстваў:

а) Падняць раньні папар на плошчы 100 тыс. гэкт., пры пасеве лубіну на ўтнаеньне на плошчы 11.300 гэкт.

б) Правесьці радковы пасеў на плошчы ня менш 70.000 гэкт., што складае каля 25 проц. плошчы ўсіх азімых.

в) Засеяць чыстым гатунковым насеньнем: жыта на 90 тыс. гэкт. і пшаніцы на 6.000 гэкт., для чаго загатовіць у межах БССР 8.829 тон. гатунковага жыта і 1.076 тон гатунковай пшаніцы і завезьці з-за меж БССР 4.600 тон гатунковага жыта «Вятка».

г) Ачыстку збожжа правесьці праз трыеры на 100 проц., што складае 43.200 тон насеннага матар'ялу па калгасах.

д) Пратруціць увесь насенны матар'ял пшаніцы, што ў абсалютных лічбах складае 1.575 тон.

е) Сабраць попелу ня менш 12.000 тон і захаваць для веснавой кампаніі будучага году над яравыя культуры.

ж) Правесьці вапнаваньне глебы на калгасах, паводле гадавога пляну на плошчы 57.900 гэкт.

з) Затарфаваць у калгасах 25.000 гэкт., для чаго загатовіць 768 тыс. тон торфу.

і) У мэтах падрыхтоўкі да пасеву яравых у 1931 г. па калгасах падняць на зяб 330 тыс. гэкт., ці ня менш 50 проц. мяркуемага яравога кліну 31 г. і правесьці лушчэньне глебы на плошчы 45.000 гэкт.

к) Прапанаваць Белсадсаюзу забясьпечыць поўнае выкананьне гадавога пляну пасадкі новых садоў у калгасах да канца асеньняй пасеўнай кампаніі на плошчы 3.500 гэкт. і правесьці належную падрыхтоўку для арганізацыі ў наступным годзе прамысловых гародаў на плошчы 10.000 гэкт., а таксама падрыхтаваць для закладкі матачных множнікаў і выхаваньнікаў саджанцаў ягадных расьлін, з разьлікам штогадовай пасадкі ягадных плянтацый на плошчы 2.500 гэкт.

III. У галіне машынаазабясьпячэньня

а) Выходзячы з вынікаў выкананьня пляну завозу сельска-гаспадарчых машын на першае паўгодзьдзе 1929-30 г. прыняць плян машына-забясьпечаньня, запраектаваны Белпаляводсаюзам на другое паўгодзьдзе г.г. для калгасаў і каапэрацыйнага насельніцтва ў суме 2.322 тыс. руб.

б) Прасіць Белсельснаб завезьці не пазьней 25/VI г. г. неабходную колькасьць уборачных і пасеўных машын для калгасаў і вытворчых аб'яднаньняў з тым, каб да 1-га ліпеня гэтыя машыны былі прасунуты да кожнага калгасу і таварыства.

в) Белпаляводсаюзу і акркалгасаюзам забясьпечыць поўнае выкананьне пляну арганізацыі рамотных майстэрань, вызначаных на гадавым пляне. У мэтах сваячасовага рамонту уборачных і пасеўных машын Белкалгасснабу забясьпечыць завоз абсталяваньня майстэрань і адпаведных матар'ялаў. Абавязаць калгасы і райкалгассаюзы рамонт уборачных і пасеўных машын скончыць не пазьней 1-га ліпеня г. г.

IV. У галіне арганізацыі цягавай сілы

У мэтах больш правільнага скарыстаньня цягавай сілы і сельска-гаспадарчых машын, у калгасах арганізаваць машына-конныя станцыі. Агравытворчай і арганізацыйнай групам распрацаваць адпаведнае палажэньне аб рабоце МКС, вызначыўшы заданьне па арганізацыі гэтых станцый на асобных акругах.

Загатовіць для калгасаў 1.500 коняй.

V. У галіне жывёлагадоўлі і стварэньня кармавой базы

а) Засіласаваць, згодна гадавым плянам, па калгасах 450 тыс. тон зялёнай масы.

б) Прымаючы пад увагу недахват стандартных сіласных вежаў, абавязаць калгасы і раённыя саюзы падрыхтаваць адпаведныя сіласныя ямы і траншэі.

в) Паводле гадавых пляноў, правесьці павярховае і карэннае паляпшэньне сенажаці на калгасах і вытворчых таварыствах на плошчы 196,1 тыс. гэкт.

VI. Фінансаваньне ўборачнай і асеньняй кампаніі

Даручыць Беларускай канторы Калгасбанку сваячасова забясьпечыць крэдытамі правядзеньне ўсіх вызначаных мерапрыемстваў уборачнай і асеньняй пасеўнай кампаніі, шырока разгарнуўшы работу па мабілізацыі сродкаў насельніцтва.

VII. Да ўдарнай, энэргічнай работы

Улічваючы, што калгаснае будаўніцтва разгортваецца ва ўмовах абвостранага клясавага змаганьня і што ў часе ўборачнай і асеньняй пасеўнай кампаніі кулацтва будзе ўсімі мерамі імкнуцца да зрыву гэтай кампаніі, каб перашкодзіць далейшай пасьпяховай калектывізацыі і ліквідацыі кулацтва, як клясы, на базе суцэльнай калектывізацыі, праўленьне Белкалгасцэнтру заклікае ўсіх калгасьнікаў і калгасьніц да арганізацыі і напружанай работы па правядзеньні ўборкі ўраджаю і азімага пасеву, даючы рашучы адпор кулацтву.

Беднякі і сераднякі некалгасьнікі на практыцы ўборачнай кампаніі і арганізаванасьці работы ў калгасах будуць упэўнівацца ў пераважнасьці буйнай калектыўнай гаспадаркі. У залежнасьці ад пасьпяховай уборкі ўраджаю і азімага пасеву, а таксама ў залежнасьці ад таго, наколькі калгасы правільна і сваячасова справяцца з рэалізацыяй ураджаю і аплатай работы кожнага калгасьніка, будзе ў значнай ступені залежаць разьвіцьцё калектыўнага руху на бліжэйшы час на БССР.

У мэтах больш поўнага скарыстаньня сельска-гаспадарчых машын і аказаньня дапамогі індывідуальным сялянскім гаспадаркам, калгасы павінны дабіцца, каб уборачныя і пасеўныя машыны і прылады ў часе ўборкі і пасеву працавалі ня менш 20 гадзін у суткі. Калгасы павінны праз адпаведныя ўборачныя, малацільныя і іншыя брыгады аказваць шырокую дапамогу бедняком і серадняком некалгасьнікам па ўборцы ўраджаю, пасеве, малацьбе і г. д.

Выходзячы з практыкі правядзеньня веснавой пасеўнай кампаніі і тых адказьнейшых задач і мерапрыемстваў, якія стаяць перад калгасамі і ўсёй калгасна-каапэрацыйнай сыстэмай на ўборцы ўраджаю і правядзеньні азімага пасеву, праўленьне Белкалгасцэнтру заклікае ўсіх калгасьнікаў і калгасьніц, а таксама ўсю калгасна-каапэрацыйную сыстэму правесьці гэту кампанію ўдарным тэмпам, на аснове сацыялістычнага спабірніцтва самых шырокіх мас калгасьнікаў і некалгасьнікаў, жорстка падпарадкуючы агню самакрытыкі ўсе недахопы нашай работы.

На час уборачнай і асеньняй пасеўнай кампаніі камандыраваць членаў праўленьня Белкалгасцэнтру і цэнтральных спэцыяльных саюзаў у акрузе ў якасьці упоўнаважаных Белкалгасцэнтру і цэнтральных саюзаў па ўборачнай і асеньняй пасеўнай кампаніі.

Даручыць аргтрупе сумесна з цэнтральнымі саюзамі вызначыць спэцыялістых і адказных работнікаў саюзаў і камандыраваць іх у раёны для арганізацыі і дапамогі ў правядзеньні ўборачнай і асеньняй пасеўнай кампаніі.

Белкалгасцэнтру тэрмінова распрацаваць і ўстанавіць, па ўзгадненьні з НКЗБ і Белкалгасцэнтрам парадак справаздачнасьці па ўборачнай і асеньняй пасеўнай кампаніі.

Старшыня праўленьня Белкалгасцэнтру МІЦЬКОЎ.

Ні аднаго гэктара незасеянай плошчы!

ВЫКАНАНЬНЕ ПЛЯНУ ПА СІЛАСНЫХ КУЛЬТУРАХ ПАД ПАГРОЗАЙ

ПОЛАЧЧЫНА ЯШЧЭ НЕ ДАБІЛАСЯ РАШУЧАГА ПЕРАЛОМУ Ў СЯЎБЕ ТЭХКУЛЬТУР

ПОЎНАСЬЦЮ ЗАСЕЯЦЬ ПУСТУЮЧЫЯ ЗЕМЛІ

Шматлікія паведамленьні з усіх округ раёнаў БССР сьведчаць, што дырэктывы партыі і ўраду аб пашырэньні пасеўнай плошчы на 13 проц. у большасьці раёнаў і округ з посьпехам выконваецца. Гэта зьяўляецца вынікам таго, што партыйныя і савецкія арганізацыі правялі належную падрыхтоўчую работу, своячасова ліквідавалі перагібы пры зьмяляўпарадкаваньні, папулярызавалі льготы за пашырэньне пасеўнай плошчы.

У паасобных раёнах і сельсаветах, однак, наглядаецца недапушчальнае адставаньне з пашырэньнем пасеўнай плошчы, а дзе-нідзе справа ідзе да поўнага зрыву гэтага важнейшага заданьня.

Вось факты. У Вяліка-Сьліўскім сельсавеце, Слуцкага раёну, які ўжо скончыў сяўбу і ў вогуле выканаў плян, пасеўная плошча зарочана на 15 проц. Не засеяна ня толькі цаліна, але нават зямля, якая ужо ня год скарыстоўвалася. Засталася заброблена зямельная плошча невялікіх дзесяткаў хутароў. Прычынай гэтага зьявіцца зьяўляецца бязьдзейнасьць сельсавету. Між іншым, пяпрыльна раскулачаныя серадняцкія гаспадаркі таксама не засеялі поўнасьцю зайго яравога кліну з тэй прычыны, што ім была вернута толькі часта надзельня.

Цікава адзначыць, што ў гэтым-жа сельсавеце малазямельныя беднякі не захацелі атрымаць ад сельсавету дадатковай плошчы для сяўбы.

У вёсцы Цэрабель, Пухавіцкага раёну (Менская акруга) на сёньняшні дзень засталіся неабробленымі 80 гэкт. зямлі. І камітэт узаемадапамогі, ні сельсавет не паклапаціліся забясьпечыць засеўнай плошчы. Заданьне аб пашырэньні пасеўнай плошчы тут ня выканана.

Сьмілавіцкі раён, Менскай акругі, выканаўшы 103 проц. пасеўнага пляну, на гэтым супакоіўся, лічачы, што ім ужо зроблена ўсё магчымае і патрэбнае. Між тым, аказваецца, што ў асобных вёсках пустуе зямля, якая засявалася ў мінулыя гады. У вёсцы Караваева, ня глядзячы на наяўнасьць пустуючых зямель, дамовіліся аддаць іх для сяўбы мясцовым бедняком. Такім чынам, у асобных вёсках раёну дырэктыва аб пашырэньні пасеўнай плошчы ня выканана.

Гомельшчына першай у БССР скончыла сяўбу, наогул выканаўшы пасеўны плян. Асобныя раёны, однак, усё яшчэ адстаюць з сяўбой. У прыватнасьці зусім недапушчальнае становішча стварылася ва Ўраравіцкім раёне. У параўнаньні з мінулым годам пасеўная плошча скарацілася на 100 гэкт. Засталіся незасеянымі лепшыя вучасткі зямлі, якія належаць індывідуальнікам. Асобныя сяляне зварачаліся ва Ўраравіцкі сельсавет з просьбай дазволіць ім абрабіць пустуючую зямлю, але там яны атрымлівалі адказ:

— Гэта зямля ня ваша і вам аб ёй нагадваць ня прыходзіцца.

У сувязі з нагрозай невыкананьня заданьня аб пашырэньні пасеўнай плошчы ў асобных мясцох «Беларуская вёска» зьвярнулася да ЦК ЛКСМБ з адкрытым лістом, у якім прапануе, каб камсамол у бліжэйшыя дні ў кожным раёне арганізаваў ударныя групы камсамольцаў і калгасьнікаў для засеву пустуючых зямель і для дапамогі бяднякам-серадняцкім гаспадаркам.

ІКЗ БССР аб ажыцьцяўленьні мерапрыемстваў па сіласаваньні

Калегія Наркамзему БССР, абгаварыўшы ход правядзеньня мерапрыемстваў па сіласаваньні, канстатавала, што сяўба сіласных культур у калгасах пад пагрозай зрыву.

Беларускія арганізацыі нічога не зрабілі для належнага разгортваньня гэтай справы. Белкалгасцэнтр, Белсельтрэст, акруговыя зямельныя аддзелы не прынялі канкрэтных мер для ажыцьцяўленьня мерапрыемстваў па сіласаваньні.

Калегія адзначыла таксама, што Саўкалгасбудам СССР да гэтага часу ня выпрацаваны стандартны тып сіласных вежаў. БССР ня вызначана цьвёрдай колькасьці вежаў і сіласарэзак. Не дасланы таксама чарцяжы ў фарбах і інструкцыі для масавага распаўсюджваньня.

Калегія пастанавіла стварыць пры Наркамземе сіласнае бюро, якое павінна кіраваць усёй работай па сіласаваньні. У акрутах і раёнах кіраўніцтва ўскладаецца на загалчыкаў зямельных аддзелаў, пад іх асабістую адказнасьць.

Загалчыкам акруговых і раённых зямельных аддзелаў даручана разгарнуць работу па выкарыстаньні ўсіх магчымасьцяй для сіласаваньня, у прыватнасьці, шырока скарыстаць усе, якія маюцца сячкарні, як у саўгасах і калгасах, так і ў пасёлках. Акруговым і раённым зямельным аддзелам, саўгастрэстам і с.-г. каапэрацыі даручана разгарнуць будаўніцтва сіласных ям і траншэй. У асобных выпадках дапускаецца будаўніцтва нестандартных тыпаў сіласных установак.

Калегія запрапанавала Белкалгасбуду ў двухдзённы тэрмін даць ня менш 100 экз. чарцяжоў простых сіласных ям і траншэй.

Дырэктару сьвіняводнай станцыі т. Журыку даручана скласьці спэцыяльную брашуру па тэхніцы сіласаваньня кармоў і выдаць яе не пазьней 20-га чэрвеня у колькасьці 100.000 экз., пад агульнай рэдакцыяй сіласнага бюро.

У Менску вырашана правесьці ў чэрвені пяцідзённыя курсы — канфэрэнцыю па сіласаваньні і сіласабудаўніцтве. Яны разьлічаны на 100 чал.

Калегія НКЗ адзначыла, што камсамольскімі арганізацыямі разгорнута шырокая растлумачальная работа праз газэту «Чырвоная Зьмена». Аднак, для канкрэтнай работы камсамолу на мясцох не хапае адпаведнага інструктажу па арганізацыі і тэхніцы сіласаваньня. Калегія вылучыла двух спэцыялістых для кансультацыі газэты «Чырвоная Зьмена» па пытаньні сіласаваньня кармоў, а таксама для асьвятленьня гэтай работы у іншых цэнтральных газэтах.

Нарэшце, калегія пастанавіла шырока апавясьціць калгасы і бядняцка-серадняцкае сялянства аб тым, што гаспадаркам або пасёлкам, якія выканаюць заданьне па сіласаваньні кармоў, будуць у [illegible] тым годзе адпушчаны канцэнтраты [illegible] кармы.

Барацьба з лугавым матылём усё яшчэ не арганізавана

Гэтымі днямі «Зьвязда» паведамляла, што ў Бабруйскай і Гомельскай округах зьявіўся лугавы матылёк і што зямельныя органы БССР не падрыхтаваны, каб змагацца з ім.

На жаль, прыходзіцца канстатаваць, што і на сёньнішні дзень становішча застаецца бяз зьмен. Да гэтага часу амаль ня прынята канкрэтных мер для змаганьня са шкоднікам. Намесьнік Наркамзему БССР тав. ПАНІМАТКА заявіў нашаму супрацоўніку, што за апошнія некалькі дзён ніякіх новых вестак няма і што пакуль што становішча не зьмянілася.

Між тым, у навукова-дасьледчы інстытут імя Леніна паступілі новыя весткі аб тым, што ЛУГАВЫ МАТЫЛЁК ЗЬЯВІЎСЯ І Ў МАЗЫРСКАЙ АКРУЗЕ, У РАЁНЕ ДАСЬЛЕДЧАЙ СТАНЦЫІ СКРЫГАЛАВА. Праўда, матылёк зьявіўся ў нязначнай колькасьці, але ён прадстаўляе небясьпеку, паколькі можа пашырыцца далей. Як відаць, Наркамзем БССР нават ня ведае, як вядзецца змаганьне з ім на мясцох.

Паводле паведамленьня навукова-дасьледчага інстытуту імя Леніна, сёньня выедзе ў Гомельшчыну (Хойніцкі і Брагінскі раёны) дырэктар станцыі аховы расьлін праф. ВАСІЛЬЛЕЎ для азнаямленьня са становішчам і з мерпрыемствамі па змаганьні з лугавым матылём на мясцох.

Трэба мабілізаваць шырэйшую ўвагу вакол змаганьня са шкоднікам. Беларускія арганізацыі павінны прыняць тэрміновыя захады.

Г.

Полацак не дабіўся рашучага пераломy

Полацкая акурга не дабілася рашучага пералому ў сяўбе тэхнічных культур і ў апошнюю пяцідзёўку. На 10 чэрвеня плян сяўбы ільну выкананы толькі на 51,8 проц., а каналель на 56,3 проц. Нязначны зрух дасягнуты толькі па ільне — за пяцідзёўку асеяна 13,5 проц. пляну, за лік узмацненьня тэмпу сяўбы індывідуальнікамі. Гэты зрух, аднак, яўна невыстарчальны і не гарантуе поўнага вы

У кітайскай Чырвонай армії

8-я Першамайская калёна

Генэрал ня ведаў

За 40 кілёмэтраў ад гораду Нінбо брыгада генэрала Чжы Туя спынілася на адпачынак. Чжы Туй пасьля трохзеннай пагоні за Хунцьзюнам (Хунцьзюн — кітайская Чырвоная армія) першы раз зьняў боты і, з асалодай расьцягнуўшыся на мяккіх цыноўках, дыктаваў у штаб чарговае данясеньне.

Чжы Туй ня ведаў, што атрады Хунцьзюна, за якімі ён гоніцца, ідуць па яго сьлядох...

Было роўна 12 гадзін ночы, калі ў ціхім і сонным паветры прагучэў першы стрэл. А ўжо праз хвіліну з усіх чатырох бакоў вёскі чутна была траскатня. Перапалоханыя салдаты кідаліся да вакон фанз, ламалі дзьверы, лезьлі на стрэхі і, напатканыя куляй, падалі на зямлю.

Так загінула брыгада Чжы Туя.

„Зброя ёсьць?"

Ля дзьвярэй нізенькай каменнай фанзы, над чырвоным сьцягам на карачках сядзеў чывонаармеец-вартавы. У руках ён сьціскаў старую, прадзедаўскую, крамнёвую стрэльбу з вялікім кухонным нажом на рулі замест штыха. Зьлева ад чырвонаармейца на нізкім сваёрным слупку ўсіяў насьпех прыбіты плякат:

«Штаб 8-й Першамайскай калёны Чырвонай армі Кітайскай Савецкай рэспублікі».

Ля дзьвярэй фанзы рос наўтош. Абараныя людзі з упалымі чорнымі шчакамі бязьлітасна націскалі адзін на аднаго.

У штабе, жыватом на падлозе (з-за адсутнасьці мэблі), ляжала трох: камандзір дывізіі — малады, прысадзісты чалавек, селянін Ляп Но-лян, яго памоцнік, ён-жа і камісар дывізіі, Сэ-Туп і сакратар камсамольскай ячэйкі.

У дзьверы бязупынным патокам ішлі людзі, якія ў жыцьці сваім ведалі толькі гора. Яны адзін за другім падыходзілі да камандзіра:

— Хачу ў Чырвоную армію.

— Дзеля чаго ідзеш?

— Чырвоная прыносіць саветы. Саветы прыносяць жыцьцё...

— Зброя ёсьць?

— Ёсьць. Вось глядзі — і прасіцель працягвае маленькі кольт.

— Ідзі. Восьмы полк, трэцяя рота. Наступны.

І зноў новыя кароткія фразы з новым прасіцелем, абавязковае ў гэтым выпадку пытаньне:

— Зброя ёсьць?

— Няма.

— Спачатку здабудзь зброю, потым прыходзь зноў.

Ліст быў кароткі

Тры галавы, закрываючы мізэрнае сьвятло лямпкі, нахіліліся над паперкай, счырканай іерогліфамі. Ліст быў кароткі. Сяляне пісалі, што ў Чуі-Чжы прыбыў атрад урадовых войск, што яны накіраваді атрад у бок, процілеглы Нінбо, і калі Лян Но-лян хоча, у яго сёньня ўначы будзе шмат харчоў, зброі і патронаў.

А праз некалькі мінут стройныя рады 8-й Першамайскай накідалі вёску, у якой, наводле заведзенага ў арміі парадку, засталося толькі чатырох, каб арганізаваць выбары ў савет, каб пераладаць усю зямлю сялянам-бедняком і размеркаваць паміж імі скаціну намешчыкаў і джэнтры, каб сачыць за умацаваньнем новай улады.

На здымку: Вэгетацыйны дзел на Усебеларускай выстаўцы

менныя сходкі. Лу застаўся на даху, адрэзаны ад усяго сьвету.

Пайшла родная брыгада. На зьмену ёй прышлі людзі ў хакі. Не падазраючы пасткі, яны цесьнымі калёнамі выйшлі на шашу. І тады з нагоды нырснуў сьмяротны струмень.

Тры разы ланцугі салдат кідаліся на шашу, і тры разы гаварыў кулямёт.

Надыходзіў вечар. Крыніцай кінела вада ў кулямётным кажуху. З пятай скрынкі разбурывалася апошняя істужка. І Лу зразумеў, што з апошнімі патронамі зьнікае яго жыцьцё. Камандзір ня прыходзіў. Лу здавалася, што час ідзе вельмі марудна. Яго вочы стаміліся сачыць за сьветлай палоскай шашы. Рука ўжо не адчувала, распаленага да чырвані цела кулямёта.

Заплюшчыўшы вочы, палажыўшы падбародак на патронную скрынку, што стояла ў яго на каленах, гойдаючыся ў такт словам, Лу засьпяваў песьню, вядомую цяпер ва ўсім Кітаі:

— Хунцьзюн цун юн чай дзі*)

Захоплены пяньнем, Лу ня бачыў, як на даху суседняга дому зьявіўся салдат. Хаваючыся за комін, ён паволна наводзіў вінтоўку.

Стрэл абарваў песьню на даху нагоды. Куля напала ў левае вока Лу...

Тры гады слаўнага змаганьня

Гэраічная Першамайская калёна нарадзілася 1 мая 1927 году. Тады гэта быў яшчэ маленькі партызанскі атрадзік. Але ўжо ў жніўні — верасьні 1927 г., у пэрыяд сялянскіх «паўстаньняў асеньняга збору ўраджаю» калёна (дывізія) пачала быстра расьці, фармуючы ўсё новыя і новыя чжы-дуй. У яе натоўпамі ішлі сяляне, для якіх уціск джэнтры і паменчыкаў рабіўся нясноcным.

Слаўны гістарычны шлях прайшла дывізія. Гэта яна ўзьняла ўпяршыню сьцяг саветаў над паветамі Хай-фын і Лу-фын, гэта яна паклала аснову гістарычнай, але яшчэ малавядомай «вандроўнай» савецкай рэспублікі «Хай-лу-фын». Яе касьцяк склалі часьці рэвалюцыйных войск, якія прымалі ўдзел у кантонскім паўстаньні і ў камуністычным паўстаньні ў Хэнані, якое ішло пад кіраўніцтвам Хэлуна і Е-ціна.

Калёна ня раз пярэсла паражэньні. Ня раз шанхайскія і кантонскія газэты паведамлялі аб поўным зьнішчэньні калёны, але мінаў месяц, калёна «ўваскрасала» і наносіла новыя і новыя ўдары урадовым войскам.

1-га мая 1930 году, у адзнаку трохгадовага юбілею калёны, на ўсёй правінцыі Гуандунь былі скліканы зьезды саветаў, якія аб'ядналі 100 мільёнаў працоўных кітайцаў.

За тры гады свайго змаганьня калёна, якая ўваходзіць у склад № корпусу Хунцьзюна, стварыла савецкую ўладу ў 8 паветах, перадала сялянам 45 тысяч му ворнай зямлі, што належала раней памешчыкам і джэнтры. Нарэшце, зусім нядаўна ў правінцыі Гуандунь ля меж Інда-Кітаю калёна пасьля васьмідзённага ўпартага бою разграміла высланыя супроць яе французскія карныя атрады і захапіла тры французскія баявыя самалёты.

Першамайская калёна прымусіла пачырванець «цывілізаваны» сьвет. У адказ на расстрэл французамі 8 палонных чырвоных камандзіраў калёны, камандзір [illegible] армії [illegible] і [illegible] мі перадала ўрадовым войскам французскіх лётнікаў, якія засталіся жывымі і папалі ў палон.

145.000

У жніўні 1929 году ў Кітаі апэравалі 4 Чырвоныя арміі. Да лютага лік іх узрос да 8, а зараз апэруе ўжо 14 армій. Цікавы і колькасны рост армії: армія Хэ-луна ў студзені 1929 г. налічвала 1 тысячу байцоў, у жніўні—8 тысяч, а на 1 красавіка — 18 тысяч.

Праўда, агульны лік усіх атрадаў Хунцьзюна не перавышае 145 тысяч байцоў. Армія дрэнна ўзброена, яна ня мае базы. Адзіная крыніца папаўненьня ўзбраеньня і баявых запасаў—разьбітыя ўрадовыя атрады. Байцы абадраныя і босыя.

Але-ж за сьпіной Хунцьзюна стаяць сотні мільёнаў працоўных кітайцаў. Чырвоная армія Кітаю рана ці позна пераможа. У гэта верыць кожны баец Хунцьзюна.

В. Л.

*) Чжы-дуй — баявая адзінка. Корпус Хунцьзюна складаецца з 3 калён, у кожнай калёне 3 чжы-дуй.

*) Чырвоная армія ўсіх мацней.

Да XVI зьезду ЎсеКП(б)— плян да варштату

На Барысаўскіх прадпрыемствах дырэктыва партыі ня выканана

Прамфінплян да цэхаў, варштатаў і асобных рабочых не даведзен

Да адказнасьці за ігнараваньне важнейшай дырэктывы

У Барысаве рабочыя брыгады ў часе налёту на прадпрыемствы выявілі рад выпадкаў нядбайных адносін з боку адміністрацыі да справы давядзеньня прамфінпляну да цэху, варштатаў і кожнага рабочага.

На фабрыках «Чырвоная Бярэзіна» і «Пралетарская Перамога» плян да варштатаў даведзен толькі **фармальна**. Прамфінплян зачытвалі на сходах цэх'ячэек, пасьля чаго ў цэхах былі вывешаны калькуляцыі, якіх рабочыя зусім не зразумелі. Вытворчыя праграмы ёсьць не ва ўсіх цэхах. Характэрна, што большая частка **загадчыкаў цэхамі** самі ня ведаюць сваіх прамфінпляпаў.

На гуце імя Домбаля прамфінплян даведзен да цэхаў і ў некаторых цэхах да асобных варштатаў. Пытаньне аб тым, як лепш давесьці прамфінплян да кожнага рабочага, абгаворвалася толькі на агульным сходзе рабочых, а па цэхах і зьмепах не прапрацоўвалася.

На заводзе «Камінтэрн» прамфінплян не даведзен да варштату і нават не да ўсіх цэхаў. Трэба адзначыць, што адміністрацыя заводу **ўпарта супраціўлялася гэтаму мерапрыемству** і толькі пасьля пастановы бюро партколектыву, калі дырэктару была вынесена вымова, адміністрацыя ўзялася за гэту справу.

На заводзе імя Розы Люксэмбург варштаты сваіх прамфінпляпаў ня маюць, ня гледзячы на тое, што належная падрыхтоўка праведзена. Справа ў тым, што дырэктар заводу **т. Рэмізаў** лічыць, што **рабочыя не павінны ведаць аб сваім прамфінпляне**, бо завод увесь час перавыконвае прамфінплян па 3-5 проц., а тав. Рэмізаў баіцца, што, калі кожны рабочы будзе ведаць прамфінплян, дык у яго адпадзе ахвота і ён пачне працаваць марудней. Таму т. Рэмізаў вывешвае **няправільныя зводкі з пераменшанымі лічбамі**. Такім агідным адносінам да рабочых трэба пакласьці канец. **Такая недаацэнка палітычнай сьвядомасьці рабочых, недаацэнка энтузіязму рабочых кажа аб чымсьці большым, чым простае галавацяпства.**

На фабрыцы «Прафінтэрн» прамфінплян складзен так, што рабочыя яго **не зразумеюць**. Крыху лепш абстаіць справа на фабрыцы «Рабочы», дзе прамфінплян даведзен да кожнага варштату.

У аснoўным-жа налёт выявіў, што **прадпрыемствы Барысава ня выканалі дырэктывы партыі аб давядзеньні прамфінпляну да цэхаў, варштатаў і кожнага рабочага.** Гэта прымусіла раённы штаб налёту паставіць пытаньне перад адпаведнымі органамі **аб прыцягненьні да адказнасьці вінаватых у невыкананьні гэтае дырэктывы.**

Трэба адзначыць, што лёгкая кавалерыя Барысаўшчыны прымала ў налёце вельмі слабы ўдзел. Амаль на ўсіх прадпрыемствах прыходзілася на некалькі раз склікаць групы «лёгкай кавалерыі», бо яны па першым заклику ня зьбіраліся. На некаторых прадпрыемствах прышлося правесьці гэту работу бяз удзелу лёгкай кавалерыі.

Н. Нахамкін і Н. Нэйман.

СПОРТ

Агульна-гарадзкія спаборніцтвы па лёгкай атлетыцы

Пачаліся агульна - гарадзкія спаборніцтвы па гульнях і лёгкай атлетыцы. Ужо адбыліся сустрэчы па футболе паміж камандамі «Дынама» будаўнікі, мэталістыя — броня-дывізыёны. Сустрэчы скончыліся з вынікам 12:1 па карысьць «Дынама» і 4:3 броня-дывізыёну.

Прыезд гомельскіх футбалістых

19 чэрвеня ў Менск прыяжджае зборная футбольная каманда Гомелю. Каманда будзе спаборнічаць са зборнай камандай г. Менску.

Пашыраны пленум акрсавету фізкультуры

18 чэрвеня адбудзецца пашыраны пленум акрсавету фізкультуры. Пленум абярэ прэзыдыум менскага акруговага савету.

Навіны МЦРК

— МЦРК пачаў адпускаць пайшчыкам **воблу**—на адным кілё для першай катэгорыі і па 500 грам на едака для 2-й і 3-й.

— Пачаўся водпуск пайшчыкам па $^1/_2$ літра **дэнатурату** на наборную кніжку па талёне жоўтага колеру № 280.

— МЦРК пачаў выдаваць пайшчыкам па **спэцыяльных талёнах** на 6 мэтраў тканіны на **бялізну**. Выдача матар'ялу на бялізну па дзіцячых кніжках спынена.

ПАПРАЎКІ

У газэце «Зьвязда» № 136 ад 13-VI быў надрукаваны ў аддзеле «Водгукі на заметкі» артыкул **«Бароўскі не вінават»**, а трэба чытаць **«Падбярэскі не вінават».**

Тав. рэдактар!

Просім не адмовіць зьмясьціць у вашай газэце наступнае: «У часопісі «Каапэрацыя БССР» № 3 (10-30 мая 1930 г.) у «Пастанове ЦК УсеКП(б) аб працы спаж. каапэрацыі» (Афіцыйны куток) старонка 53 у 4-м радку 2-га слупка на недагледзе карэктара ўкралася такая памылка:

Надрукавана: «Лічыць неабходным, каб у паказаных плянах былі ў першую чаргу забясьпечаны інтарэсы Масквы, Ленінграду, Данбасу, Крыварожжа і Ураду», а трэба:

«Лічыць неабходным, каб у паказаных плянах былі ў першую чаргу забясьпечаны інтарэсы Масквы, Ленінграду, Данбасу, Крыварожжа і Ураду».

З тав. прывітаньнем рэдактар часопісі «Каапэрацыя БССР»

ГІНЗБУРГ.

Віцебшчына—пасьля рэарганізацыі

Першыя вынікі рэарганізацыі савецкага апарату

Нядаўна закончылася зробленае камісіяй НК РСІ БССР абсьледваньне і падвядзеньне вынікаў рэарганізацыі Віцебской спробна-паказальнай акругі. Зараз ужо ставіцца пытаньне аб пашырэньні практыкі па іншыя акругі ня толькі БССР, але і большасьці абласьцей Саюзу.

Якія-ж вынікі віцебскай практыкі?

Дырэктыва XVI партканфэрэнцыі аб дэцэнтралізацыі апэрацыйных функцый і перанясеньні цэнтру цяжару ўсёй апэрацыйнай работы ў раён—у Віцебскай паказальнай акрузе выканана поўнасьцю.

Значная частка праў і функцый перададзены ад акрвыканкомаў райвыканкомам і ад апошніх—сельсаветам. Адначасова за лік апарату акрвыканкомаў і яго ранейшых аддзелаў былі значна ўзмоцнены апараты райвыканкомаў, а таксама сельсаветаў.

Практыка праробленай работы рэарганізаванага апарату і праведзеная нядаўна праверка рэарганізацыі паказалі, што гэта практыка у вогуле і цалкам сябе апраўдала, РВК і сельсаветы значна ўзмацніліся і ператварыліся ў сапраўдныя органы дзяржаўнага кіраўніцтва на мясцох. Прыкметна ўзьняўся аўтарытэт гэтых органаў і вырасла давер'е мас да іх.

Лепш за ўсё аб гэтым сьведчыць той факт, што пасьля рэарганізацыі сыстэмы савецкага кіраўніцтва ў акрузе **значна скарацілася наведваньне сельскім насельніцтвам АВК.** Зараз сялянс па ўсіх сваіх справах і скаргах зварачаюцца ўжо непасрэдна ў сельсаветы і РВК, атрымліваючы на мясцох поўнае вырашэньне ўсіх хвалюючых іх пытаньняў. Апрача таго (як гэта было адзначана ў пастанове калегіі НК РСІ БССР аб выніках праведзенай спробы ў Віцебскай акрузе), дзякуючы рэарганізацыі, **Віцебская акруга ў выкананьні цэлага раду апэрацыйна-плянавых заданьняў (загатоўкі і г. д.) аказалася ўпераздзе ўсіх округ Беларусі, выканаўшы многія заданьні са значным перавышэньнем плянавых намячэньняў.**

Разам з тым, трэба адзначыць, аднак, што адна надзвычай сур'ёзная задача рэарганізацыі ўсё-ж ня была ажыцьцёўлена. Ня гледзячы на ўзмацненьне РВК і сельсаветаў, ня гледзячы на перакідваньне акруговых работнікаў у раёны, усё-ж для правядзеньня цэлага раду кампаній прыходзілася ў «мабілізацыйным» парадку насылаць работнікаў на месцы ў дапамогу РВК і сельсаветам. Між тым, рэарганізацыя мела таксама мэтай вызваленьне сыстэмы ад надобных мабілізацый. Праўда, у значнай меры неабходнасьць надобнай насылкі работнікаў на месцы ў мінулы пэрыяд часу была зьвязана не з работай звычайна га парадку, аз выключнымі ўмовамі калектывізацыі, з неабходнасьцю ліквідаваць перагібы мясцовых работнікаў і г. д. Але ўсё-ж прыходзіцца канстатаваць, што ў гэтай частцы мэта вопыту поўнасьцю не дасягнута.

Сыстэма **адказных выканаўцаў**, паказаная пастановай XVI партканфэрэнцыі, у апарацэ самога акрвыканкому спачатку была даведзена да сваласаблівага «канца», які заключаўся ў наступным: пасьля ліквідацыі ўсіх аддзелаў АВК былі створаны пасады асобных функцыянэраў, з якіх кожны паасобку падпарадкаваўся непасрэдна старшыні АВК, прычым кіраўніцтва работай інспэктароў не канцэнтравалася і не аб'ядналася на якой-небудзь галінпай адзнацы.

Практыка 6-месячнай работы рэарганізаванага апарату паказала, што надобнае пабудаваньне сыстэмы адказных выканаўцаў зьяўляецца толькі мэханізаваным спрашчэньнем самой ідэі. Асноўны дэфект падобнага пабудаваньня сыстэмы адказных выканаўцаў заключаўся ў тым, што паміж работай асобных інспэктароў, якія абслугоўвалі адну і тую-ж галіну (напрыклад, сельскую гаспадарку, прамысловасьць і г. д.), адсутнічала ўсякая арганічная ўвязка. Кожны інспэктар дзейнічаў сэпаратна, ствараючы шкодны рознабой і абстаноўку бескантрольнасьці, натуральна, і безадказнасьці.

У сучасны момант, пасьля праверкі вынікаў 6-месячнай практыкі, самі аўтары надобнай сыстэмы адказных выканаўцаў прышлі да неабходнасьці яе зьмены, якая і праведзена ўжо ў наступным напрамку: увесь апарат АВК разьбіт па галінных аднаках на чатыры групы: 1) прамысловасьці, будаўніцтва і транспарту; 2) абмену; 3) сельскае гаспадаркі і 4) сацыяльна-культурнага будаўніцтва.

Кожная група аб'яднае ўсіх інспэктароў, працуючых у данай галіне, і падпарадкоўвае члену прэзыдыуму АВК, які зьяўляецца разам з тым арганічным работнікам групы. Гэты кіраўнік групы, не атрымліваючы ніякіх адміністрацыйных функцый, разам з тым мае права самастойна вырашаць усе бягучыя пытаньні кіруемай ім галіны работы ад імя прэзыдыуму АВК.

Але самым істотным момантам рэарганізацыі апарату Віцебскага АВК зьяўляецца **сыстэма ўвязкі плянаваньня з кантролем выкананьня.**

Паводле першапачатковага праекту рэарганізацыі, у апараце віцебскага АВК павінна было-быць прароблена поўнае разьяднаньне плянаваньня і кантролю выкананьня. Мысьлілася, што плянавае бюро самастойна распрацоўвае ўсе пляны ня толькі сынтэтычнага характару, але нават усе апэрацыйныя заданьні ў тэй ці іншай меры, якія носяць плянавы характар, і перадае іх раённым арганізацыям для выкананьня, а інспэктарам для кантролю іх выкананьня.

Такім чынам, наводле гэтай ідэі, інспэктары не павінны былі прыняць удзелу ў плянавай рабоце, а плянавікі павінны былі заставацца ў баку ад кантролю выкананьня плянаў.

Падобнае схэматычнае падзяленьне функцый пагражала, з аднаго боку—адрывам плянавай работы ад жыцьця, а з другога—адрывам апэрацыйнай работы ад плянаваньня.

На здымку:—павільён садоўніцтва на Усебеларускай выстаўцы

АВК павінна было-быць прароблена поўнае разьяднаньне плянаваньня і кантролю выкананьня. Мысьлілася, што плянавае бюро самастойна распрацоўвае ўсе пляны ня толькі сынтэтычнага характару, але нават усе апэрацыйныя заданьні ў тэй ці іншай меры, якія носяць плянавы характар, і перадае іх раённым арганізацыям для выкананьня, а інспэктарам для кантролю іх выкананьня.

Такім чынам, наводле гэтай ідэі, інспэктары не павінны былі прыняць удзелу ў плянавай рабоце, а плянавікі павінны былі заставацца ў баку ад кантролю выкананьня плянаў.

Падобнае схэматычнае падзяленьне функцый пагражала, з аднаго боку—адрывам плянавай работы ад жыцьця, а з другога—адрывам апэрацыйнай работы ад плянаваньня.

Таму на практыцы Віцебскага АВК адбылося вымушанае, напеаркор схэме, злучэньне абедзьвюх функцый—плянаваньня і апэрацыйнага кантролю, бо гэтага патрабавала само жыцьцё.

Я. Пайкін.

ПАВЕДАМЛЕНЬНІ

СЁНЬНЯ

Дом Асьветы. Адбудз. экстрэнны сход камсам. калектыву Працасьветы. Пач. а 6 гадз. веч.

Дом Камасьветы. У п. № 21 індыв. кансультацыя па матэматыцы і фізіцы т. Гэльфанда і індыв. кансультацыя па паліт-эканоміі т. Лур'е. Пач. а 6 гадз. веч.

Наркамасьветы. У памяшк. Наркамасьветы адбудз. нарада па абгаварэньні разьмеркаваньня скончыўшых курсы па падрыхтоўцы ў ВНУ, ВТНУ, тэхнікумы і рабфакі. Выклікаюцца прадстаўнікі ЦСПСВ, ЦК ЛКСМ, ВСНГ, акрна і загадчыкі падрыхтоўчых курсаў г. Менску. Пач. а 11 гадз. ран.

Пушкінская біб-ка. У памяш. (Кастрычніцкая вул. № 5, 2-гі паверх) адбудз. пасядж. бібліятэчнага савету. Яўка членаў бібл. савету абавязк. Пач. а 7 гадз. веч.

Серабранская бібліятэка-чытальня рас пачала сваю работу пасьля перапынку, і зьмяшчаецца ў будынку 29-й школы (Палявая вул. пры Чэрвеньскім тракце) і адкрыта з 3 да 9 гадз. веч.

Клюб будаўнікоў: У клюбе адбудз. сход камуністых усіх будаўнічых арганізацый Фрунзаўскага раёну. У нарадку дня: даклад аб ходзе будаўніцтва і задачы ў рабоце парт'ячэек. Яўка партыйцаў абавязк. Пач. а 6 гадз. веч.

ЗАЎТРА

БДУ. У вайсковым габінеце БДУ адбудз. супрацьтыфусныя прышчэпкі для студэнтаў, якія ідуць у лягеры. Яўка абавязк. Прышчэпкі будуць праводзіцца з 9 да 12 гадз. дня.

Вячэрні рабфак. Экскурсія студэнтаў вячэрняга рабфаку ў Ленінград выязджае 15-га чэрвеня. Збор на вакзале а 4 гадз. дня. Тыя, што едуць у экскурсію, павінны зьявіцца для канчатковай рэгістрацыі 14-га чэрвеня а 8 гадз.

Фізыка - матэматычная асацыяцыя. У фізычнай аўдыторыі Пэдфаку—даклады: 1) т. **Дыдырка** «Аб некаторых лінейчатых паверхнях у сувязі з набудаваньнем мадэляй, і 2) т. **Успенскі** «Хвалявая тэорыя матэрыі». Пач. а 17 гадз.

БДУ. У наталёгіка-анатомічным корпусе адбудз. сход студэнтаў 3-га і 4-га курсаў мэдфаку. У нарадку дня—аб вытворчым практыкуме. Яўка абавязк. Пач. а 10 гадз. раніцы.

Жакт № 16. З 13-га па 25-ае чэрвеня прымаюцца заявы ў дзіцячыя яслі пры жакце № 16. Заявы падаваць у канцылярыю жакту.

ПАСЬЛЯЗАЎТРА

Жакт № 16. 16-га чэрвеня стаўляцца пры жакце № 16 пачнае выдаваць абеды членам жакту. Жадаючыя абедаць павінны атрымліваць талёны 14 і 15 чэрвеня ў канцылярыі жакту з 2 да 7 гадз. дня. Адначасова неабходна здаць свае мясныя карткі. Таварыны, не атрымаўшыя талёны ў паказаны тэрмін абедаў не атрымаюць.

Адказны рэдактар Ян. АСЬМОЎ.

Калектыў супрацоўнікаў ЦКК-РСІ Бел. выказвае спачуваньне сям'і тав. **РЫСКІНА А. Б.** з прычыны сьмерці іх сына

ЯШЫ

Калектыў супрацоўнікаў ЦКК-РСІ.

15-VI а 7 гадз. веч. адбудзецца прэзыдыум

Кастрычніцкага РК МОПР'у.

Прысутнасьць сяброў прэзыдыуму і сяброў Райкому абавязкова.

Запрашаецца актыў.

БЕЛДЗЯРЖТЭАТР 13, 14, 15 чэрвеня пастаноўкі мастацкага перасоўнага тэатру «КРАСНЫЙ ФАКЕЛ»
ПРЭМ'ЕРА **„НАШЕСТВИЕ НАПОЛЕОНА"**
Пастаноўка рэжысэра тэатру рэвалюцыі В. Ф. Фёдарава. Афармленьне мастака І. Ю. Шлепанава. Музыка Лістава.
Білеты ў рабочай касе, астача білетаў у касе тэатру.
Пачатак а 8 г. 30 м. увечары.

Тэатр саду „Прафінтэрн" Гастролі 1-га Маскоўскага перасоўнага тэатру ОПЭРЫ І БАЛЕТУ
Сёньня, 14 чэрвеня **„ПИКОВАЯ ДАМА"**
муз. Гайкоўскага.
Білеты ў касе тэатру і ў рабочай касе.
Пачатак а 8 г. 30 м. веч.

Кіно-тэатр „Культура" Толькі 2 дні 14, 15 чэрвеня падвойная вялікая праграма
Дзенабрухаў і Анцябрухаў камэдыя ў 6 част.
5 год будаўніцтва СССР
Пачатак а 8 г. і а 10 г. Каса—ад 6 гадз.

КІНО Інтэрнацыянал 2-гі ТЫДЗЕНЬ Мастацкая кіно-аповесьць **ВЕЦЕР У ТВАР**
— ЗВЫШ ПРАГРАМЫ: —
кіно-хроніка Беларусь Савецкая № 6 — Прысьвечаная XIII зьезду КП(б)Б
Пачатак 1-га сэансу а 7 гадз. Каса—ад 5 г.

—)КІНО(— САД (Савецкая, 71)
Новы замежны мастацкі фільм
РВАНЫЯ ВЕТРАЗІ
— у 8 частках —
ПАЧАТАК 1-га СЭАНСУ а 9 ГАДЗ.
Каса адкрыта з 6 гадз.

КІНО Пралетарый АПОШНЯЯ 3-я СЭРЫЯ
—МІС МЭНД—
у 10 частках
Пачатак 1-га сэансу а 7 гадз.
Каса адкрыта з 5 гадз.

1-шы дзіцячы кіно-тэатр „Юны Піянэр" 2-ГІ ТЫДЗЕНЬ
„КРАСНЫЕ ДЬЯВОЛЯТА"
2 сэрыі 12 частак у адзін сэанс
Пачатак 1-га сэансу а 2 гадз.
Каса адкрыта з 12 гадз.

КІНО СПАРТАК Нямецкі мастацкі баявік
ЧЭМПІЁН СЬВЕТУ ў 7 част.
У галоўнай ролі КСЕНІЯ ДЭСЬНІ
Пачатак 1-га сэансу а 7 гадз., 2-га—9 гадз.
Каса—з 5 гадз. 30 м.

Дом Асьветы 15 чэрвеня
КАНЦЭРТ ансамблю жаночай творчасьці
Прымаюць удзел: артыстка савецкай філярмоніі **Роза УМАНСКАЯ** (скрыпка), артыстка Маскоў. к. Дзярж. Опэры **А. А. ЛАРЫНА** (санрано) і салістка савецкай філярмоніі **М. А. ГРЫНБЭРГ** (раяль).
У праграме—творы расійскіх і замежных кампазытараў.
БІЛЕТЫ Ў КАНЦЫЛЯРЫІ ДОМУ з 12—2 і з 6—10 гадзін увечары.

ИЗДАТЕЛЬСТВО „БЕЗБОЖНИК"—МОСКВА, Сретенка, 10.
ПОДПИСЫВАЙТЕСЬ И ВЕРБУЙТЕ ПОДПИСЧИКОВ на июль и до конца 1930 г. на:
газету „БЕЗБОЖНИК" (массовая иллюстр. популярн. газета для города и деревни) — журнал „БЕЗБОЖНИК" (двухнедельный литер.-худож. журнал для города и деревни) — ежемесячник „АНТИРЕЛИГИОЗНИК" (научно-методич. журнал для городского и деревенского актива) — журнал „АТЕИСТ" (ежемесячный сборник научных материал. для города) — журнал „ДЕРЕВЕНСКИЙ БЕЗБОЖНИК" (массовый антирелигиозный журнал для деревни)
Вербовщики подписки на издания „Безбожника" примут участие в четвертом большом конкурсе 1930 года. КОНКУРС СОСТОИТСЯ в июле с. г.
БЕСПЛАТНО! АНТИРЕЛИГИОЗНУЮ БИБЛИОТЕЧКУ из 5 БРОШЮР БЕСПЛАТНО!
получат все подписчики на газету и журнал «Безбожник» и журнал «Деревенский Безбожник», если они подпишутся с июля м-ца до конца года.
— Издания рекомендованы Пуром, Наркомпросом, ВЦСПС —
ПОДПИСНЫЕ ЦЕНЫ:

	1 мес.	3 мес.	6 мес.	12 мес.
Газета „Безбожник"	— 20	— 60	1.20	2.40
Журнал „Безбожник"	— 30	— 90	1.80	3.60
„ „Антирелигиозник"	— 60	1.80	3.50	6.50
„ „Деревенский Безбожник"	— 20	— 60	1.20	2.40
Журнал „Атеист"	— 75	2.25	4.—	7.50
С 1 августа будет выходить на польском языке газета „Воинствующий Безбожник"	— 15	— 45	—90	1.80

ПОДПИСКА ПРИНИМАЕТСЯ: Во всех почтовых отделениях и письмоносцами, изд-вом „Безбожник" (Москва, Сретенка, 10) и его инструкторами, во всех отделениях Госиздата, во всех потребобществах, потребсоюзах, уполномоченными изд-ва „Гудок", „Кооперативная Жизнь", во всех Советах Воинствующих Безбожников, низовыми сборщиками при ячейках безбожников и всеми другими распространителями печати.

50 К. кошт публікацыі аб згубе дакумента

ЛЯЧЭБНІЦА — МЕНСКАГА КАМІТЭТУ ГАРАДЗКОГА УЗЕМАДАНАМОГО
Ленінская, № 25, побач з 2-м Домам Савэтаў, тэл. 12-66
АДКРЫТА ад 9 гадз. ран. да 9 г. увеч
Прыём хворых па ўсіх спэцыяльнасьцях:
па ўнутраных, хірургічных, жаночых, вочных, хваробах вуха, горла і носа, скурана-венэрычных, страўніцкіх, нэрвовых.
Электра-ультра-лячэньне і кварц адкрыты з 11—2 гадз. дня і 5—8 гадз. увеч.
Рэнтген (здымкі, прасьвечваньні, лячэньне) адкрыт з 4 г. 30 м. да 9 г. увеч.
Прыём хэміка-бактэрыялягічных аналізаў. Аптэка.
ЗУБНЫ ГАБІНЭТ адкрыт з 9 г. раніцы да 9 г. увеч. штодзённа
Кансультацыя прафэсароў па ўсіх спэцыяльнасьцях на папярэднім запісе.
Урачэбная дапамога на дому па ўсіх спэцыяльнасьцях. Запісь з 9 гадз. раніцы да 2 гадз. дня.
Дэжурства дактароў з 2 гадз. дня да 9 гадз. увеч.
Начное дэжурства дактароў ад 9 гадз. увеч. да 7 гадз. раніцы.
Прыём хворых па лекавых кніжках камітэту. Для ўсіх іншых грамадзян за агульна-даступную дыфэрэнцыяваную плату.

Механік па рамонце швэйных машын і сьлесар шукае працы
Зварачацца ў м. Глуск, Бабруйскай акр., НЭЙМАНУ М. М.

Для здачы **АБВЕСТКІ** ў газэту **„ЗЬВЯЗДА"** звяніце па тэл. **7-81**

На тыдневую канфэрэнцыю Усебеларускай Завочнай Саўпартшколы павінны зьявіцца 15 чэрвеня г. г.
толькі тыя курсанты, якія атрымалі пасьведчаньні аб выкліку і літары на праезд.
Не атрымаўшыя літароў будуць выкліканы на наступную канфэрэнцыю асобным паведамленьнем.
Усебеларуская Завочная саўпартшкола.

Даводзіцца да ведама, што 20 чэрвеня пры Лесбеле **адчыняюцца**
2-хмесячныя курсы па перападрыхтоўцы рахункаводаў і бухгальтараў
адз. Лесбелу і лясьніцтваў для леспрамгасаў.
На курсы прымаюцца рахункаводы і бухгальтары лясьніцтваў і адз. Лесбелу, а таксама беспрацоўныя якія знаходзяцца на вуліце біржы працы. Жадаючыя паступіць на курсы павінны прыслаць заявы і завершыць анкеты. Анкеты можна атрымаць у лясьніцтвах і аддзелах Лесбелу не пазней 16 чэрвеня г. г.
УМОВЫ—захаваньне пенсіі і поўнае ўтрыманьне.

МАЗЫРСКАЙ АКРУГІ
Скрыгалаўскі Культуртэхнікум з 3-гадовым тэрмінам навучаньня па падрыхтоўцы аграномаў культуртэхнікаў
ПАВЕДАМЛЯЕ, ШТО
ПРЫЁМ ЗАЯЎ на 1930-31 г.
пачынаецца з 1-га ліпеня па 1-е жніўня.
Правілы прыёму абвешчаны падрабязна ў газ. «Чырвоная Зьмена» ў чэрвені месяцы.
Дырэктар Тэхнікуму КУРДО.

15 чэрвеня а 7 гадз. увечары ў клюбе глуханямых па Савецкай вуліцы адбудзецца
АГУЛЬНЫ СХОД ЧЛЕНАЎ ЖАКТ'у і жыхароў уноў прынятых дамоў ЖАКТ'у № 16.
ПАРАДАК ДНЯ:
1. Аб перавысарах праўленьня і ровкамісіі.
2. Выбары брыгад і выбарчай камісіі для праверкі працы.
3. Прыём у члены ЖАКТ'у.
ПАСЬЛЯ СХОДУ—КІНО.

Згубленыя і ўкрадзеныя дакументы лічыць несапраўднымі

Вуч.-конск. кн. Абрамовіча А. Г., выд. Чавуск. васн. ст. 539
Вуч.-конск. карт. Колбіна В. А., выд. Мен. ваенкаматам за № 457 540
Пашп. Баршай З. І., выд. Барысаўск. адмаддз. 541
Каап. кн. Аранько М., выд Мухаедаўск. спаж. т-вам 542
Паявая кн. № 1385 Цыбулька А. П., выд. Бярэзінск. спаж. т-вам 543
Вайск. кн. Бірыло З. С., выд. 5 п. 2 Бел. дыв. 544
Чырвонаарм. кн. Губарэвіча Б. Б., выд. 4 чырвонаштанд. стр. п. 545
Вайск. кн. Зубчэнка Ф. Е., выд. Чэрв. прыз. вуч. 546
Вайск. біл. Брынеевіча І. П., выд. Сьвярдлоўск. асноўн. прыз. кам. 547
Вуч.-конск. карт. Гуленкова Е., выд. Чавуск. васн. ст. 548
Вуч.-конск. карт. Аскольчанка Ф., выд Чавуск. раён. васн. ст. 549
Мэтр. вып. Бясьсьмертнага М. У., выд. Чавуск. раён. міліцыяй 550
Вуч.-конск. карт. Капура Н., выд. Чавус. РВК 551
Вуч.-конск. карт. Каханоўскага Л., выд. Чавуск. РВК 552
Вуч.-конск. карт. Капура Н., выд. Чавуск. РВК 553
Вуч.-конск.